УЛ. ФРУНЗЕ 16 ИН. ТУТ
СОВ. СТРОИТ. И ПРАВДА

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 12 (5686) | 15 студзеня 1937 г., пятніца | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

III сесія ЦВК СССР VII склікання — Заключнае слова народнага камісара фінансаў СССР тав. Г. Ф. **Грынько.** Прамовы тав. Я. І. **Ластоўскага.**

Народы СССР зноў пачулі голас правадыра.

Аб узнагароджанні Тбіліскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета — Пастанова ЦВК Саюза ССР.

Узнагароджанне ўдзельнікаў дэкады грузінскага мастацтва ў Маскве.

Дадатковыя капіталаўкладанні ў справу развіцця грузінскага мастацтва..

Артыкулы: Перадавы — Бюджэт соцыялістычнай дзяржавы. **І. М. Офенгейм**— Партыйны сход — школа большэвіцкага выхавання. **З. Леўсон**—Узнялася якасць падрыхтоўкі да партсходаў.

Алесь Стаховіч — У карчэўі.

За граніцай: Фашысцкія мяцежнікі адкінуты на выходныя пазіцыі. Падрабязнасці бамбардыроўкі Малагі.

Планы інтэрвентаў. Падрыўная работа германскай дыпламатыі на Далёкім Усходзе.

Сутычкі паліцыі з бастуючымі ў ЗША.

БЮДЖЭТ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Учора ў «Звяздзе» была апублікавана пастанова трэцяй сесіі ЦВК Саюза ССР па дакладу народнага камісара фінансаў тав. Грынько аб дзяржаўным бюджэце на 1937 год.

Дзяржаўны бюджэт Саюза ССР складзе ў 1937 годзе па даходах 98 мільярдаў, па расходах — 97,1 мільярда рублёў.

У адрозненне ад велізарнай большасці капіталістычных краін, выконваючых свой бюджэт з дэфіцытам, дзяржаўны бюджэт СССР на працягу раду год выконваецца з велізарным перавышэннем даходаў над расходамі. У 1937 годзе гэты лішак складзе 950 мільёнаў рублёў. Гэты факт ярка сведчыць аб перавагах совецкай планавай гаспадаркі над капіталістычнай.

Дзяржаўны бюджэт у 1937 годзе ў параўнанні з 1936 годам узрастае на 14,67 мільярда руб., г. зн. на 18 процантаў. Такіх тэмпаў росту, калі, вядома, мець на ўвазе нармальны грашовы зварот, не ведае ні адна краіна!

Дзяржаўны бюджэт СССР — соцыялістычны бюджэт — цалкам адказвае прынцыпам соцыялістычнага грамадства. «У лічбах дзяржаўнага бюджэта СССР на 1937 год поўнасцю знайшлі сваё аллюстраванне правы грамадзян СССР, запісаныя ў вялікай Сталінскай Канстытуцыі». (Г. Грынько).

Народная гаспадарка ў 1937 годзе будзе расці ў тэмпах, поўнасцю забяспечваючых выкананне другога пяцігадовага плана. Аднак фінансаванне народнай гаспадаркі з бюджэта застаецца на ўзроўні 1936 года, усю астатнюю частку сродкаў, неабходных для развіцця прамысловасці, транспарту і гандлю, гаспадарка атрымае з уласных накапленняў. Гэта з'яўляецца новым фактам у нашай эканоміцы. І гэты факт знамянуе сабой велізарную перамогу ўсёй нашай гаспадарчай палітыкі, ажыццёўленай пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна.

У капіталістычных краінах з кожным годам скарачаюцца бюджэтныя сродкі на народную асвету, на ахову здароўя. У фашысцкай Германіі лік студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў за адзін толькі 1933 год скараціўся з 128 да 89 тыс. чалавек. У Польшчы бюджэты на школу скараціліся ў параўнанні з 1929-30 навучальным годам амаль у паўтара раза. За гэты кошт растуць ваенныя расходы.

У СССР па дзяржаўнаму і мясцовым бюджэтах прадугледжваецца расход на народную асвету 18,2 мільярда рублёў супроць 13,9 мільярда рублёў у 1936 годзе. Колькасць вучняў пачатковай і сярэдняй школы павялічыцца на аснове ўсеагульнага навучання на 2,5 мільёна і дасягне к канцу 1937 года 30 мільёнаў чалавек. Так ажыццяўляецца ў СССР 121 артыкул Сталінскай Канстытуцыі, які гаворыць аб праве грамадзян СССР на асвету.

На ахову здароўя намечана выдаткаваць 7,5 мільярда рублёў супроць 5,8 мільярда рублёў у 1936 годзе.

Штодзённую выключную ўвагу і клопаты дзяржавы і вялікага Сталіна аб совецкай сям'і і совецкіх дзецях аллюстроўваюць лічбы расходаў на ахову мацярынства і дзяцінства. Бюджэт 1936 года прадугледжваў асігнаванне на гэтыя мэты 1.127 мільёнаў рублёў. Пасля выдання дэкрэта аб забароне абортаў і дапамозе рожаніцам і шматсямейным мацярам лічба гэта была павялічана да 2.044 мільёны рублёў. А бюджэтам 1937 года вызелена на ахову мацярынства і дзяцінства 3.173 мільёны рублёў! Апрача таго расходы соцыяльнага страхавання на дзяржарнасці і родах складуць 1.108 мільёнаў рублёў.

Бурнымі апладысментамі сустрэла сесія ЦВК СССР паведамленне тав. Грынько аб павелічэнні асігнавання Наркамату абароны з 14.900 мільёнаў рублёў у 1936 годзе да 20.102,2 мільёна рублёў у бягучым годзе. З велізарнай радасцю сустракаюць гэту вестку ўсе працоўныя нашай неасяжнай краіны, адабраючы павелічэнне расходаў на абарону, як і ўвесь бюджэт соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

Дзяржаўны бюджэт СССР — бюджэт брацкага садружества вызваленых пролетарскай рэволюцыяй народаў нашай неасяжнай радзімы. Дзяржава дапамагае сродкамі раней адсталым народнасцям, пералічваючы ў бюджэты рэспублік частку дзяржаўных даходаў. У сувязі з гэтым моцна растуць рэспубліканскія і мясцовыя бюджэты. Асабліва высокі тэмп росту запраектован у новых саюзных рэспубліках (Казахстане—46 проц., Кіргізскай—69 проц., Армянскай — 31 проц. і т. д.).

Расце рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты БССР. У 1937 годзе расходы рэспубліканскага і мясцовага бюджэта складуць, прыкладна, 918 мільёнаў рублёў супроць 801,4 мільёна рублёў у 1936 годзе. На соцыяльна-культурныя мерапрыемствы пры гэтым асігнуецца 674 мільёны рублёў супроць 563,5 у 1936 годзе.

Значныя сродкі прадугледжваюцца на ўпаралкаванне раённых цэнтраў. Сесія ЦВК СССР у сувязі з гэтым павялічыла агульную суму бюджэта амаль на 300 мільёнаў рублёў. Гэтыя дадатковыя сродкі пойдуць на будаўніцтва кінотэатраў, абсталяванне бібліятэк і іншых культурных устаноў раённых цэнтраў, а таксама на іх упарадкаванне.

Дзе-ж крыніцы даходу ў такой значнай меры ўзросшага бюджэта?

Урады капіталістычных краін будуюць свае дзяржаўныя бюджэты, галоўным чынам, на падатковай сістэме. Падаткі з насельніцтва — вось асноўная крыніца даходаў у Германіі, Польшчы, Італіі, Японіі і інш. капіталістычных дзяржавах. Усякае павелічэнне расходаў дзяржаўнага бюджэта ў капіталістычных краінах (а гэта павелічэнне амаль заўсёды ідзе на ваенныя расходы) па сутнасці з'яўляецца новым бесаромным аграбленнем працоўных мас, матэрыяльны ўзровень і заработкі якіх і без таго нізкія.

Дзяржаўныя даходы Саюза ССР зусім іншага паходжання. У аснову даходнай часткі бюджэта на 1937 год пакладзен рост прадукцыі прамысловасці супроць 1936 года на 20 проц. і рознічнага тавараабароту на 23,6 проц.

Велізарнай і асноўнай крыніцай даходаў з'яўляецца ў нас падатак з абароту соцыялістычнай прамысловасці. У 1937 годзе падатках з абароту, цяжкай прамысловасці мяркуецца атрымаць 9 мільярдаў рублёў, ад лёгкай прамысловасці — каля 11,14 мільярда рублёў, ад харчовай прамысловасці—20,4 мільярда рублёў і т. д.

Падаткі з насельніцтва ў дзяржаўным бюджэце складаюць нязначную вялічыню. Агульная сума сельскагаспадарчага падатку з калгаснікаў і аднаасобнікаў, праектуемая ў бюджэце, у нас не зменяецца на працягу раду год, тады як даходы працоўных растуць.

Такія крыніцы даходаў бюджэта соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян. Працоўныя нашай краіны ясна разумеюць залежнасць бюджэта ад гаспадаркі, і, значыцца, ад прадукцыйнасці працы, ад умелай работы, ад таго, як мы ўмеем напярэджваць падрыўную работу ворага. Народны камісар фінансаў СССР тав. Г. Ф. Грынько зусім правільна сказаў у сваім дакладзе, што для поўнага выканання бюджэта дзяржавы «треба яшчэ шырэй разгарнуць стаханаўскі рух, зламаць да канца адсталыя кансерватыўныя элементы ў гаспадарцы і вырваць з карэннем, выпаліць без астатку шкодніцкія спробы гнусных агентаў фашызма, праклятых наследышаў троцкісцка-зіноўеўскай і правай банды дыверсантаў, шкоднікаў, забойцаў і шпіёнаў, якія прабуюць затармазіць пераможны ход нашага соцыялістычнага будаўніцтва».

Сесія ЦВК СССР, заверджаўшы бюджэт СССР, настойліва патрабуе ад усіх працоўных і совецкіх арганізацый барацьбы за перавыкананне бюджэта, скарыстання сродкаў па прызначэнню, найстражэйшага захавання бюджэтнай дысцыпліны і далейшае ўмацаванне совецкага рубля.

Дзяржаўны бюджэт — гэта закон, які павінен безагаворачна і безумоўна выконвацца ўсімі совецкімі органамі, усімі грамадзянамі СССР.

ЗЛЁТ СТАХАНАЎЦАЎ ВІЦЕБСКАГА ВУЗЛА

13 студзеня адбыўся агульнавузлавы злёт стаханаўцаў-крываносаўцаў віцебскага чыгуначнага вузла. Злёт заслухаў даклад начальніка палітаддзела віцебскага аддзялення тав. Васількоўскага і судаклады начальнікаў усіх служб аб становішчы вузла і задачах на 1937 год.

Лепшыя стаханаўцы вузла (дыспетчар Мяжэвіч Аня, старшы кандуктар Сімановіч, машыніст Котнеў, старшы стрэлачвік Цінчанка) дзяліліся вопытам сваёй стаханаўскай работы. Яны падверглі рэзкай крытыцы работу каманднага і палітычнага складу вузла за слабае кіраўніцтва стаханаўскім рухам, што з'яўляецца асноўнай прычынай дрэннай работы вузла.

У адказ ленінградскім чыгуначнікам на злёце быў заключан соцыялістычны дагавор паміж чыгуначнікамі віцебскага і аршанскага вузлоў. Прыводзім асноўныя пункты дагавору.

Прапаваць без адзінай аварыі, крушэння і парушэння правіл тэхнічнай эксплаатацыі.

Грузіць у суткі не менш 115 проц. задання і выгружаць не менш 110 проц. Камерцыйную хуткасць давесці да 33,5 кілометра ў гадзіну замест заданых 29,7 кілометра.

Канчаткова ліквідаваць моманты недачы і позняй выдачы паравозаў пад поезды.

Сярэднесутачны прабег паравозаў грузавога руху давесці да 400 кілометраў і тэхнічную хуткасць не менш 40 кілометраў у гадзіну.

Міжпрамывачны прабег паравоза давесці да 6 тыс. кілометраў замест заданых 4 тысяч.

Дабіцца эканоміі вугалю на 15 проц. і вадзіць поезды на любых сумесях.

Скараціць прастой паравозаў у сярэднім гадавым рамонце на 20 проц. супроць плана.

Замест заданых 52 вагоны ў месяц па сярэднему рамонту рамантаваць 60 і па гадавому рамонту замест 134 вагонаў—150. Вагоны рамантаваць высокаякасна без астатку на наступныя суткі.

Соцыялістычны дагавор падпісалі 200 стаханаўцаў-крываносаўцаў віцебскага вузла і спецыяльна прыехаўшая на злёт делегацыя аршанскіх чыгуначнікаў.

Чыгуначнікі віцебскага вузла адначасова выклікалі на спаборніцтва чыгуначнікаў ст. Гомеля і Нова-Сакольнікі. Злёт паслаў прывітальныя тэлеграмы наркому шляхоў зносін Л. М. Кагановічу і сакратару ЦК КП(б)Б тав. Гікало.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

Сакратару ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО
Старшыні СНК—тав. ГАЛАДЗЕДУ
Старшыні ЦВК БССР—тав. ЧАРВЯКОВУ

Мы, паравозныя брыгады пасажырскага паравоза мэгілеўскага дэпо Беларускай чыгункі, рыхтуючыся да Надзвычайнага XII Усебеларускага З'езда Советаў, узялі на сябе абавязацельства зрабіць 20 тыс. кілометраў міжпрамывачнага прабегу без заходу ў дэпо на рамонт. Гэта абавязацельства мы выканалі. На гэтым мы не спыніліся і ў адказ на зацверджанне новай Сталінскай Канстытуцыі ўзялі абавязацельства зрабіць 25 тысяч кілометраў міжпрамывачнага прабегу пры норме 5 тыс. кілометраў. 11 студзеня сваё абавязацельства мы перавыканалі, зрабіўшы прабег 27 тыс. 600 кілометраў. Сярэднесутачны прабег складаў 500 кілометраў пры норме 320 кілометраў. Маем эканомію паліва. Рухаючы механізм акказаўся ў добрым становішчы.

У адказ на пісьмо ленінградскіх чыгуначнікаў правадыру народаў таварышу Сталіну, ажыццяўляючы ўказанні, зробленыя на селектарнай нарадзе 6 студзеня наркомам тав. Л. М. Кагановічам, абавязваемся давесці міжпрамывачны прабег да 35.000 кілометраў пры норме 5.000 кілометраў. Працаваць без аварый і браку. Мець эканомію паліва 10 проц. Будзем перадаваць свой вопыт іншым і будзем змагацца за перадавое дэпо на Беларускай чыгунцы.

Машыніст-ордэнаносец ГРУШЭЦКІ,
Машыніст-крываносавец ОПІДОВІЧ,
Начальнік дэпо КУДРАЎЦАЎ,
Парторг БОНДАРАЎ,
Учком РЫМКЕВІЧ.

Сталявар Дарафееў уключаецца ва ўсесаюзнае спаборніцтва

ГОМЕЛЬ. (**Кар. «Звязды»**). Гомельскі вагонарамонтны завод імя Ланцуцкага мае сваю сталеліцейную, якая абслугоўвае свой і рад іншых заводаў БССР стальным фасонным ліцём. Гэта сталеліцейная за адзін год работы поўнасцю асвоіла сваю праектную магутнасць.

Старэйшы сталявар ліцейнай Салон Нікалаевіч Дарафееў 37 год працуе сталяварам і дасканала аўладаў справай сталеварэння. Ён з выхаванымі ім сваімі памочнікамі сталяварамі Арлоўскім і Шамчыкавым пры няпоўным абсталяванні сталяваркі здолеў дабіцца бясспрэчных поспехаў. Ён скараціў працэс варкі з 40 да 15 мінут. Памочнік т. Дарафеева — тав. Шамчыкаў — днямі зрабіў варку за 9 мінут.

Кожны дзень сталяварка завода выдае па 13 тон стальнога фасоннага ліцця (розныя дэталі), што перавышае праектную магутнасць.

Зараз тав. Дарафееў са сваімі памочнікамі ўключыўся ва ўсесаюзнае спаборніцтва сталявараў і абавязаўся падвоіць прадукцыйнасць сваёй сталяваркі.

Як былы данбасавец, тав. Дарафееў мяркуе звязацца са знатнымі сталяварамі Данбаса Маззаем і Чайкоўскім, каб пераняць іх вопыт і гэтым самым яшчэ больш павялічыць прадукцыйнасць сваёй сталяваркі.

П. ЧЫКУН.

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ТБІЛІСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА ОПЕРЫ І БАЛЕТА

ПАСТАНОВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА САЮЗА ССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза ССР **пастанаўляе:**

За выдатныя поспехі ў справе развіцця грузінскай тэатральнай культуры, народных песень і танцаў узнагарадзіць Тбіліскі дзяржаўны тэатр оперы і балета **ордэнам Леніна.**

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР І. АКУЛАЎ.

Масква, Крэмль.
14 студзеня 1937 г.

Узнагароджанне ўдзельнікаў дэкады грузінскага мастацтва ў Маскве

За выдатныя заслугі ў справе развіцця грузінскага опернага мастацтва, грузінскай музыкі, песні і танцаў ЦВК Саюза ССР узнагародзіў ордэнам Працоўнага Чырвонага сцяга 10 удзельнікаў дэкады грузінскага мастацтва ў Маскве — кіраўнікоў, артыстаў Тбіліскага тэатра оперы і балета і этнаграфічных хораў Усходняй і Заходняй Грузіі: тт. Андгуладзе, Аміранішвілі, Баланчывадзе, Гварамадзе, Кумсіашвілі, Мікеладзе, Сохадзе, Цупунава, Каўсадзе і Пачкорыя.

Ордэнам «Знак почета» узнагароджана 37 чал.

Усе ўдзельнікі дэкады пастановай СНК СССР прэміраваны двухмесячным акладам.

Дадатковыя капіталаўкладанні ў справу развіцця грузінскага мастацтва

Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанавіў у мэтах стварэння найбольш спрыяльных умоў для работы Тбіліскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета адпусціць 3 млн. руб. на будаўніцтва жылога дома для артыстаў і 700 тысяч рублёў на рэканструкцыю будынка тэатра.

СНК СССР пастанавіў зацвердзіць будаўніцтва ў 1937 г. канцэртнай залы пры кансерваторыі ў Тбілісі коштам у 1 млн. руб. і адпусціць 500 тысяч руб. на рэканструкцыю будынка грузінскай дзяржаўнай кансерваторыі.

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ЗА ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ

АДКАЗВАЕМ НА ЗАКЛІК ПЕРАДАВІКОЎ

Калгаснікі Уздзенскага пагранічнага раёна горача адгукнуліся на заклік пашыранага пленума зернавой секцыі Усесаюзнай акадэміі навук імя **Леніна** і зварот калгаснікаў сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны партызан», Менскага раёна, і спецыялістаў Наркамзема БССР аб разгортванні соцыялістычнага спаборніцтва за высокі ўраджай.

Абмеркаваўшы на агульных калгасных сходах гэтыя заклікі, першым у раёне ўключыўся ва ўсесаюзнае спаборніцтва за высокі ўраджай калгас «Чырвоны Ясень», узяўшы абавязацельства забяспечыць у гэтым годзе збор ураджаю не мэнш 25 цэнтнераў з гектара зернавых, 8 цэнтнераў ільноваланна, 300 цэнтнераў бульбы і 500 цэнтнераў буракоў.

У соцыялістычнае спаборніцтва за зналагічныя паказальнікі ўраджаю ўжо ўключыліся таксама калгас імя Менжынскага, Хатчанскага сельсовета, «Комінтэрн», Венькаўскага сельсовета, і рад іншых. Кожны калгас, уключаючыся ва ўсесаюзнае спаборніцтва, вызначае канкрэтныя мерапрыемствы па ўгнаенню глебы, разгортванню агратэхвучобы, падрыхтоўцы высокаякаснага насення, падрыхтоўцы цягавай сілы і т. д.

У мэтах уцягнення ва ўсесаюзнае спаборніцтва за высокі ўраджай усіх калгасаў раёна 4 студзеня ў раённым цэнтры праведзена нарада ўсіх старшынь калгасаў і сельсоветаў, на якой абмеркаваны зварот пашыранага пленума зернавой секцыі Усесаюзнай акадэміі навук імя Леніна і зварот калгаснікаў сельгасарцелі «Чырвоны партызан». Менскага раёна.

Я. ІВАШЫН.

За 40 цэнтнераў зярна з гектара

У выніку чэснай і добрасумленнай працы калгаснікі сельгасарцелі «Першае мая», Слуцкага раёна, атрымалі ў 1936 годзе багаты ўраджай. У брыгадзе Стругача Сямёна атрымана з паасобных участкаў пшаніцы і аўса па 32 цэнтнеры з гектара. У астатніх брыгадах атрымана па 250 цэнтнераў бульбы з гектара і па 700 цэнтнераў кармавых буракоў.

Уключыўшыся ва ўсесаюзнае соцыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай, калгаснікі ўзялі на сябе абавязацельства — дабіцца ў гэтым годзе ўраджаю пшаніцы, ячменю і аўса па 40 цэнтнераў з гектара, бульбы не менш 300 цэнтнераў і не менш адной тоны ільноваланна з гектара.

Знатны брыгадзір Стругач Сямён ужо зараз прыступіў да работы па забяспечанню высокага ўраджаю. Ён намеціў ужо ўчасткі пад пшаніцу, ячмень і авёс. На апрацоўку рэкордных участкаў вылучана звяно з лепшых калгаснікаў і калгасніц (тт. Махлай Антон (звеньевы), Каплан Зісель, Мароз Есіп, Семяновіч Ганна і Казляк Марыя).

Па азімай пшаніцы т. Стругач мяркуе, як толькі растае снег, пасеяць па 3 цэнтнеры на гектар сільвініту. Апрача гэтага праз некаторы час зрабіць падкормку конскім гноем. Зямлю пад авёс, як толькі растае снег, паспружыніце, пасее суперфасфат і правядзе раннюю сяўбу.

Вік. СУХОЦКІ.

***

Калгаснікі і калгасніцы сельскагаспадарчай арцелі «Шлях ленінізма», **Капыльскага** раёна, на агульным сходзе абмеркавалі адозву ўдзельнікаў пашыранага пленума зернавой секцыі Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя **В. І. Леніна** аб арганізацыі соцыялістычнага спаборніцтва за высокі ўраджай.

Уключыўшыся ва ўсесаюзнае спаборніцтва, калгаснікі абавязаліся ў 1937 годзе дабіцца па ўсіх зернавых культурах не менш 150 пудоў з гектара, а азімай пшаніцы і ячменю — 170 пудоў з гектара ў сярэднім. З рэкордных участкаў рашылі атрымаць азімай пшаніцы і ячменю не ніжэй 250 пудоў, не менш 1.800 пудоў бульбы і 7 цэнтнераў ільноваланна з гектара.

Для таго, каб атрымаць такі высокі ўраджай, намечан рад канкрэтных мерапрыемстваў: загатовіць да вясны 500 тон торфу, 80 цэнтнераў попелу, 4 тоны курынага памёту, закупіць і вывезці 53 тоны мінеральнага ўгнаення. Выпрацаваны агратэхнічныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы насення, апраноўцы глебы і правядзенню сяўбы. Аграномы Цімкавіцкай МТС тт. Мрочак і Вайпэхоўская абавязаліся аказаць калгасу практычную дапамогу ў атрыманні высокага ўраджаю.

У адказ на адозву Ўсебеларускай нарады дзяўчат-трактарыстак

Адозва ўсебеларускай нарады дзяўчат-трактарыстак знайшла гарачы водгук сярод усіх трактарыстаў Совецкай Беларусі. У машынатрактарных станцыях, на курсах, у калгасах усе дзяўчаты-трактарысткі, камбайнеркі, ільноцеребільшчыцы, усе маладыя калгаснікі ордэнаноснай БССР з вялікім узрымам сустрэлі прапанову аб уключэнні ва ўсесаюзнае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку і правядзенне веснавой сяўбы.

У Заслаўскай МТС адозва прапрацавана ўсімі трактарыстамі і трактарысткамі, якія працуюць на рамонце, усімі курсантамі трактарных курсаў. Выступілі ўдзельніцы усебеларускай нарады Казлоўская Марыя і Бельская. Яны пералалі вопыт работы лепшых трактарыстак-тысячніц. Трактарысты і трактарысткі МТС, уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва, узялі на сябе абавязацельствы: даць у 1937 годзе на кожны трактар не менш 1000 гектараў, да 20 студзеня поўнасцю і высокаякасна адрамантаваць трактары.

НАРОДЫ СССР ЗНОЎ ПАЧУЛІ ГОЛАС ПРАВАДЫРА

Голас вялікага правадыра зноў гучаў у эфіры. Народы СССР у другі раз слухалі з затоеным дыханнем выдатны даклад Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Советаў, запісаны на плёнцы. Запіс даклада трансляваўся ўчора ў 6 гадзін вечара па ўсяму Саюзу.

У сталіцы БССР—Менску—трансляцыю слухалі дзесяткі тысяч працоўных. Яны зноў перажывалі радасныя мінуты, слухаючы словы мудрага Сталіна аб самай дэмакратычнай канстытуцыі свету — Канстытуцыі СССР.

Яго словы слухалі ў кватэрах, інтэрнатах, клубах, ленкутках, партгабінетах, у сталовых, цэхах, на вуліцы, у магазінах. Калгаснікам Менскага раёна даклад трансляваўся па тэлефонных правадах ва ўсе сельсоветы.

Па даных толькі ад 28 прадпрыемстваў і жактаў горада трансляцыю слухалі ля 2.072 радыёкропак звыш 20.000 чалавек. На заводах імя Варашылава, Молатава, Мяснікова, «Большэвік», на фабрыках «Комунарка» і «Кастрычнік» тысячы рабочых, работніц і членаў іх сямей слухалі гістарычны даклад. На хлебазаводзе слуханне было арганізавана на кватэрах стаханаўцаў тт. Хэйфеца, Пількевіча, Мельцэра і Лісоўскага.

Стаханавец завода імя Мяснікова слесар Нікалай Самойлаў, які слухаў даклад, з энтузіязмам заявіў: «Вялікае шчасце для нас, што мы яшчэ раз мелі магчымасць слухаць даклад вялікага Сталіна». Кровельшчык гэтага-ж завода стаханавец Іосіф Врублеўскі сказаў: «Я вельмі рад, што запісан на плёнцы выдатны даклад генія чалавецтва таварыша Сталіна. Яго змогуць слухаць і вывучаць будучыя пакаленні».

У Ратамскі сельсавет, Менскага раёна, з'явіліся слухаць даклад таварыша Сталіна калгаснікі, якія жывуць за 6—7 кілометраў ад сельсавета. Старшыня калгаса імя Варашылава т. Копузаў прышоў за 7 клм. у сельсавет са сваімі калгаснікамі. Рабочыя з соўгаса «Тарасава» прыехалі ў сельсавет на машынах.

Трансляцыя запісу даклада таварыша Сталіна выклікала новы творчы ўздым і энтузіязм у працоўных Менска. Калі з раструбаў рэпрадуктараў пачуўся «Інтэрнацыянал», які спявалі дэлегаты З'езда, працоўныя, узбуджаныя і ўсхваляваныя, усталі і таксама заспявалі міжнародны пролетарскі гімн.

І. ЦЫВЕС.

Работніцы менскай швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» слухаюць трансляцыю па радыё даклада таварыша Сталіна, запісанага на плёнку. Фото С. Грына і В. Лейна (БСФ)

ВІЦЕБСК. Сёння зноў, як і ў знамянальны дзень адкрыцця Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Советаў працоўныя Віцебска слухалі па радыё запісаны на плёнку гістарычны даклад таварыша Сталіна аб новай Канстытуцыі.

Масавае слуханне даклада таварыша Сталіна праводзілася ў клубах, інтэрнатах і на рабочых кватэрах. Даклад слухалі на кватэры дэлегата Надзвычайнага VIII З'езда Советаў, стаханаўкі фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» Папковай Доры Майсееўны, старшай тэлефаністкі віцебскага вузла ордэнаноскі Ніхневіч, стаханаўца паравознага дэпо Тетюшэва і ў сотнях іншых кватэр рабочых, служачых, інжынераў, урачоў і т. д.

Поўна і ў студыі радыёвузла. Тут даклад таварыша Сталіна з вялікай увагай слухалі член ЦВК БССР — стаханавец завода імя Кірава тав. Сандлер, дэлегат Надзвычайнага XII Усебеларускага З'езда Советаў, стаханаўка фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» Фелізак, знатны калгасны брыгадзір калгаса імя Чырвонай Арміі тав. Пышкін і інш. Даклад таварыша Сталіна таксама трансляваўся па тэлефонных правадах ва ўсіх сельсоветах раёна.

ЖАНЧЫНЫ МАЦУЮЦЬ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЦЬ КРАІНЫ

У адказ на зварот Усесаюзнай нарады жонак камандзіраў Чырвонай Арміі жонкі начальніцкага складу Цэнтральнага совета Асоавіяхіма БССР звярнуліся з заклікам да ўсіх жонак партыйных, совецкіх і асоавіяхімаўскіх работнікаў Совецкай Беларусі— узняць абаронную работу сярод усяго грамадскага насельніцтва, расшырыць і ўмацаваць работу Асоавіяхіма.

«Калі жонкі камандзіраў і палітработнікаў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, — пішуць яны, — працуюць над узняццем боездольнасці часцей Чырвонай Арміі, над узняццем палітычнага і культурнага ўзроўню чырвонаармейцаў, над стварэннем утульнасці, чыстаты і парадку, дык наша задача заключаецца ў тым, каб усямерна садзейнічаць падрыхтоўцы без адрыву ад вытворчасці лётчыкаў, танкістаў, кавалерыстаў, варашылаўскіх стралкоў, парашутыстаў, павесці ўзорны парадак на ваенна-вучэбных пунктах для пасяховай падрыхтоўкі дапрызыўнікаў».

У практычную работу па навядзенню культуры і парадку ў кавалерыйскай школе Цэнтральнага совета Асоавіяхіма, аўташколе, стралковым клубе, клубе ПІХА, вучэбным пункце уцягнута ўжо больш 25 жонак работнікаў Асоавіяхіма. Адначасова з правядзімай работай жонкі рыхтуюцца здаць экзамен па праграме не менш чым двух гурткоў (ГПД, ГСА, ПІХА, варашылаўскі стралок, варашылаўскі коннік і інш.).

Усёй гэтай работай кіруе збраная ініцыятыўная група ў складзе В. С. Галадзед, П. І. Данілавай, А. В. Кузняцовай, Т. Елісеевай і М. В. Драгун.

ВАЕННА-ФАШЫСЦКІ МЯЦЕЖ У ІСПАНІІ

МЯЦЕЖНІКІ АДКІНУТЫ НА ЗЫХОДНЫЯ ПАЗІЦЫІ

АГЛЯД ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯЎ

3 студзеня Франко, падпягнуўшы на ўчастак Мадрыд—Вальдэмарыльо шматлікія мяцежныя і германскія войскі, значную тэхніку — прыкладна 120 — 150 танкаў і 150—200 гармат, пачаў наступленне ў паўночным і паўночна-заходнім напрамку. Перад гэтымі войскамі была пастаўлена задача — захапіць эскарыяльскую дарогу і выйсці к Мадрыду з паўночнага захада і з поўначы.

Да гэтага часу, пакуль эскарыяльская дарога знаходзіцца ў руках урадавых войск, гвадарамская пробка не толькі перагараджвае шлях войскам генерала Мола на Мадрыд, — яна вымушае Франко апіравда на адзіную дарогу (з Талаверы), якая знаходзіцца пад пастаянным пагрозай удару з боку ўрадавых войск. Усё снабжэнне мадрыдскай арміі мяцежнікаў пабудавана на гэтай надзвычайна хісткай аснове. Далей урадавыя войскі, апіраючыся на эскарыяльскую чыгунку і шасейную дарогу, навісаюць на левым флангу мяцежных войск пад Мадрыдам і паралізуюць іх манеўраную здольнасць. Пасля правалу спроб узяць Мадрыд лабавой маланкападобнай атакай Франко не раз прабаваў шукаць абходных шляхоў і выйсці на эскарыяльскую дарогу. Але ўсе гэтыя спробы заканчваліся правалам.

Пачынаючы наступленне 3 студзеня, Франко прадпрыняў яшчэ адну спробу ў гэтым напрамку.

К 9 студзеня мяцежнікам удалося вырашыць частку пастаўленай перад імі задачы: яны перарэзалі чыгуначную і шасейную дарогі Мадрыд—Эскарыял і наблізіліся к Мадрыду з паўночнага захада. Але ўжо сталі сказвацца вынікі велізарных людскіх страт, панесеных мяцежнікамі. Яны вымушаны былі аслабіць інтэнсіўнасць свайго наступлення, тым больш, што іх флангі ўсё больш абнажаліся. Падпягнуўшы свежыя рэзервы, мяцежнікі 11 студзеня раніцой аднавілі наступленне на ўчастку Арабака—Універсітэцкі гарадок. Двухразовыя жорсткія атакі мяцежнікаў былі адбіты з вялікімі для іх стратамі. Гэта быў крытычны момант дзеяцізеннага сражэння. Урадавыя войскі, адбіўшы атакі мяцежнікаў, перайшлі ў контрнаступленне ў паўднёва-заходнім кірунку на Арабаку, Махадаонду, Лас Росас і адначасова ў паўднёва-ўсходнім напрамку з раёна Вальдэморыльо. Клін мяцежных войск аказаўся пад падвойным ударам з флангаў, што вымусіла мяцежнікаў пачаць быстрае адступленне на лінію Вільянуэва дэль Пардзільо, Махадаонда, Посуэло. К 12 студзеня на радзе ўчасткаў мяцежнікі аказаліся адкінутымі амаль на свае зыходныя пазіцыі ад 3 студзеня. Ініцыятыва знаходзіцца ў руках урадавых войск.

Упершыню абаронцы Мадрыда памераліся сіламі не толькі з адборнымі мяцежнымі войскамі, але і са шматлікімі германскімі часцямі і мелі значны поспех. Старанна падрыхтаваная мяцежнікамі і інтэрвентамі аперацыя на паўночна-заходнім участку мадрыдскага фронта правалілася. Эскарыяльская шасейная дарога ачышчана ад мяцежнікаў (дарога гэта праходзіць, прыкладна у поўкілометра паўночней Арабакі). Наступленне рэспубліканцаў паспяхова развіваецца, ставячы пад пагрозу абодва флангі мяцежнікаў, што можа прывесці да катастрафічнага для іх выходу ўсёй гэтай аперацыі, распрацаванай германскімі штабнымі афіцэрамі. («Известия»).

СТАНОВІШЧА НА ФРАНТАХ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

ПАРЫЖ, 14 студзеня. (БЕЛТА). У апублікаваным сёння ў поўдзень паведамленні камітэта абароны Мадрыда гаворыцца:

«Туман і дождж перашкаджалі колькінебудзь сур'ёзным аперацыям на мадрыдскім фронце. У раёне Універсітэцкага гарадка дапаможная калона мяцежнікаў была захвачана намі знянацку і прымушана ўцякаць. Мяцежнікі страцілі 11 чалавек забітымі. Захвачана 5 палонных і два кулямёты.

У часе контратакі, у рэзультаце якой рэспубліканскія войскі зноў занялі Вільянуэва дэль Пардыльо, рэспубліканцамі захвачана 200 палонных і 30 кулямётаў».

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 13 студзеня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення агенцтва Рэйтэр, мяцежнікі перакінулі ўсе наяўныя войскі з Ла Ліпеа і Сан Роке (на поўнач ад Гібралтара) на фронт Эстэпоны, дзе яны сустракаюць моцнае супраціўленне ў сваім наступленні ў напрамку на Малагу. Для перавозкі падмацаванняў мяцежнікамі мабілізаваны аўтобусы, грузавікі і таксі. У паведамленні ўказваецца, што рэспубліканскія войскі павялі моцную контратаку з Эстэпоны (на паўднёвы захад ад Малагі) і прасоўваюцца на тэрыторыю, захвачаную мяцежнікамі.

Учора афіцэры мяцежнікаў у Ла Ліпеа (каля Гібралтара) абходзілі ўсе дамы ў пошуках людзей, якіх можна было-б паслаць на фронт. У напрамку на Эстэпону было адпраўлена, такім чынам, 1.500 чал.

Як указваюць газеты, аперацыямі мяцежнікаў на фронце Эстэпоны кіруюць італьянцы. У мяцежнікаў ёсць танкі і агнямёты.

Крэйсеры мяцежнікаў «Альміранта Сервера» і «Канарыяс» пусціліся ў пагоню за ўрадавым параходам «Араларменді», які накіроўваўся ў Малагу з грузам харчавання з порта Сантандэр. Ратуючыся ад пагоні, параход выкінуўся на мель у Торрэм Олінос (на паўднёвы захад ад Малагі).

***

Горад Малага сёння раніцой падвергся жорсткай бамбардыроўцы з паветра і з мора. Рэзультаты бамбардыроўкі дакладна яшчэ невядомы.

ЦЭНТРАЛЬНЫ ФРОНТ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 14 студзеня. (БЕЛТА). У афіцыяльным паведамленні, апублікаваным учора ў 21 гадзіну 30 мінут у Мадрыдзе, гаворыцца:

«У сектары Гвадалахары (на паўночны ўсход ад Мадрыда) артылерыя мяцежнікаў бамбардыравала нашы пазіцыі. Аднак адказны агонь урадавай артылерыі прымусіў мяцежнікаў спыніць бамбардыроўку».

Лінія размяшчэння мяцежнікаў на мадрыдскім фронце на 9 і 12 студзеня.

Падрабязнасці бамбардыроўкі Малагі

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 13 студзеня. (БЕЛТА). Згодна паведамлення англійскіх газет, у часе бамбардыроўкі Малагі (горад на поўдні Іспаніі) мяцежнікамі быў пашкоджан будынак англійскага консульства і разбуран будынак больніцы. Усе хворыя загінулі. Адначасова з бамбардыроўкай Малагі з паветра і з мора, мяцежнікі прабавалі прадпрыняць наступленне на фронце Эстэпоны (на паўднёвы захад ад Малагі), аднак, сустрэлі жорсткае супраціўленне.

Афяры абстрэлу Валенсіі

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя ўрада), 13 студзеня. (БЕЛТА). Учора пры абстрэле Валенсійскага порта караблём мяцежнікаў першыя снарады папалі ў сялянскі дом за 2 кілометры ад порта, на дарозе, якая вядзе з горада ў вёску Назарэт. На тэрыторыі бензінахавальніка і электрастанцыі забіты дзве жанчыны і два мужчыны.

Асабліва моцна пацярпеў ад абстрэлу фашысцкіх піратаў шпіталь вёскі Назарэт. Туды папалі тры снарады, калі ўрачы рабілі вячэрні абход. Два ўрачы ранены. Усяго пры бамбардыроўцы порта было забіта 7 і ранена 17 чалавек.

Законапраект аб забароне адпраўкі добраахвотнікаў ва Францыі

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 14 студзеня. (БЕЛТА). Сёння пад старшынствам Эрыо адбылося пасяджэнне палаты дэпутатаў. Глава ўрада Леон Блюм указаў, што ўрад уносіць законапраект, які дае яму поўнамоцтвы прымаць усе меры да спынення адпраўкі добраахвотнікаў у Іспанію. Палата без спрэчак адобрыла прапанаваны парадак дня, пасля чаго пасяджэнне закрылася.

ПЛАНЫ ІНТЭРВЕНТАЎ

Дакладная запіска генерала Фаўпеля і Гітлеру.

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 13 студзеня. (БЕЛТА). Як перадае парыжскі карэспандэнт англійскай ліберальнай газеты «Ньюс кронікл», германскі паверанны ў справах пры «ўрадзе» мяцежнікаў генерал Фаупель у дакладной запісцы да Гітлера ўзяў пад рэзкую крытыку ваенныя аперацыі мяцежнікаў.

Паводле слоў Фаупеля, у галоўным штабе мяцежнікаў пануюць інтрыгі і саперніцтва. Фаупель падкрэслівае, што ў мяцежнікаў нехапае арганізаванасці. Паводле яго слоў, іспанская грамадская думка ў асноўным варожа мяцежнікам. Фаупель указвае, што мяцежнікам патрэбны мінімум 80 тысяч германскіх войск, каб забяспечыць перамогу.

Як ён указвае, гэтыя войскі могуць быць пасланы на наступных умовах:

1) аперацыямі павінны кіраваць германскі і італьянскі генеральныя штабы;

2) 300 германскіх інструктароў павінны быць пасланы для кіраўніцтва «іспанскай фалангай»;

3) становішча ў Іспанскім Марока павінна быць умацавана шляхам пасылкі германскіх экспертаў па каланіяльных пытаннях;

4) германа-іспанскім кампаніям у Марока павінны быць прадастаўлены буйныя эканамічныя канцэсіі, прычым кантроль павінен знаходзіцца ў руках германцаў;

5) германскія вэйскі павінны быць пакінуты ў Іспаніі пасля перамогі Франко, «пакуль краіна не будзе ўціхамірана».

Карэспандэнт сцвярджае, што Гітлер адобрыў даклад Фаупеля.

Гітлер, паводле слоў карэспандэнта, сказаў: «Мы не пакінем Іспанію, пакуль не атрымаем назад нашых калоній».

Падрыўная работа германскай дыпламатыі на Далёкім усходзе

ТАЛІН (сталіца Эстоніі), 9 студзеня. (БЕЛТА). Гітлераўская газета «Рэвальшэ цэйтунг», якая выдаецца ў Эстоніі на нямецкай мове, балбоча, якімі метадамі берлінская дыпламатыя зрывае мір на Далёкім Усходзе.

У карэспандэнцыі з Токіо (сталіцы Японіі) газета паведамляе, што асноўнай прычынай спешнага падпісання япона-германскага пагаднення з'явілася тое, што «Японія рыхтавалася заключыць з СССР тры пагадненні (аб праве рыбнай лоўлі, аб канцэсіі на нафтавыя промыслы і аб стварэнні арбітражнай камісіі для ўрэгулявання пагранічных пытанняў). рэзультатам якіх, калі-б яны былі заключаны, несумненна, з'явілася-б значнае збліжэнне паміж Японіяй і СССР». Для зрыву падпісання гэтых пагадненняў была пушчана ў ход уся фашысцкая агэнтура ў Японіі, у рэзультаце чаго было паскорана падпісанне япона-германскага пагаднення. Газета не ўтойвае свайго задавальнення тым, што вынікам гэтага пагаднення з'явілася пагаршэнне япона-совецкіх адносін.

Сутычкі паліцыі з бастуючымі ў ЗША

НЬЮ-ІОРК (буйнейшы цэнтр ЗША), 12 студзеня. (БЕЛТА). Бастуючыя рабочыя, заняўшы прадпрыемства фірмы «Фітэр бодзі» ў Флінце (штат Мічыган, ЗША), аказваюць рашучае супраціўленне паліцыі. Прабуючы выгнаць бастуючых з прадпрыемства, паліцыя напала з кулямётамі і бомбамі, начыненымі слезатачывым газам, на тысячу рабочых, якія ахоўваюць прадпрыемства.

Пры гэтым нападзе шмат рабочых было ранена, але ўсё-ж паліцыя не змагла прабрацца на прадпрыемства. Губернатар штата Мічыган мабілізаваў войска супроць бастуючых.

III СЕСІЯ ЦВК СССР VII СКЛІКАННЯ

ЗАКЛЮЧНАЕ СЛОВА НАРОДНАГА КАМІСАРА ФІНАНСАЎ СССР тав. Г. Ф. ГРЫНЬКО

Таварышы, абмеркаванне дзяржаўнага бюджэта на 1937 год у Саюзным Совеце і ў Совеце Нацыянальнасцей паказала, што сесія ЦВК СССР у цэлым, абедзве яе палаты, з аналушнасцю падтрымліваюць унесены Соўнаркомам СССР дзяржаўны бюджэт. Якіх-небудзь пярэчанняў у спрэчках заяўлена не было, не засталося і колькі-небудзь істотных спрэчных пытанняў. Таму ў сваім заключным слове я абмяжуюся толькі радам растлумачэнняў па ўзнятых у спрэчках пытаннях і некаторых прапановах.

З другога боку, я павінен адзначыць, што, побач з аднадушным падтрыманнем бюджэта, чырвонай ніткай праз усе спрэчкі ў Саюзным Совеце і Совеце Нацыянальнасцей праходзіла глыбокае разуменне ўсёй дзяржаўнай важнасці нашага бюджэта, які пасля запвярджэння яго ЦВК становіцца законам.

Сапраўды, патрэбнасцей у нас вельмі многа. Гіганцка расце гаспадарка краіны, узнімаецца культура народных мас. Растуць патрэбнасці найшырэйшых мас працоўных горада і вёскі, а ў мясцовых советаў ёсць вялікая ахвота як мага хутчэй гэтыя патрэбнасці задаволіць. І ў гэтым законным і правільным імкненні як мага хутчэй задаволіць узрастаючыя матэрыяльна-бытавыя і культурныя запатрабаванні насельніцтва вельмі часта мясцовыя советы трапяць меру, пераходзяць граніцу сваіх магчымасцей, мудруюць, мудруюць, а потым і заблытваюцца са сваім бюджэтам. Ні да чаго добрага гэта не вядзе, а перашкаджае задавальненню ўзрастаючых патрэбнасцей насельніцтва.

Таму трэба сурова трымацца рамак зацверджанага бюджэта, найстражэйшым чынам захоўваць мэтавае назначэнне намечаных па бюджэту сродкаў і думаць аб дадатковых расходах толькі пасля таго, як накопіш дадатковыя даходы.

Каб унікнуць непарадкаў у выкананні мясцовых бюджэтаў, каб унікнуць так званых касавых напружанняў і затрудненняў, трэба, каб усе рэспублікі і краі паследавалі ў 1937 г. добраму прыкладу Украінскай Совецкай рэспублікі. Гады два таму назад на Украіне таксама бывалі касавыя затрудненні. СНК УССР у мінулым годзе рашыў у межах зацверджаных ужо рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў Украіны, за кошт некаторага змяншэння расходаў і барацьбы за дадатковыя даходы, стварыць пастаянны касавы рэзерв дзяржаўнага і мясцовых бюджэтаў Украіны, і украінцы гэтага дабіліся. Калі на пачатак 1936 года ў іх было ўсяго 40 млн. руб. вольных бягучых рахункаў мясцовых бюджэтаў, то к канцу 1936 г. яны давялі вольныя бягучыя рахункі мясцовых бюджэтаў да 150 млн. руб., не лічачы 70 млн. руб. па рэспубліканскаму бюджэту Украіны. І ні разу на працягу ўсяго 1936 г. мы не чулі аб якім-небудзь касавым затрудненні на Украіне, аб несвоечасовай выплаце зарплаты, ці аб чым-небудзь падобным. На жаль, не ўсе яшчэ саюзныя рэспублікі следуюць гэтаму адзіна правільнаму парадку выканання бюджэта і нярэдка спяшаюцца расходаваць ненакопленыя яшчэ грошы.

У адпаведнасці з новай Сталінскай Канстытуцыяй мы павінны будзем ужо ў першай палове 1937 года пераарпрацаваць існуючае палажэнне аб рэспубліканскіх і мясцовых бюджэтах з улікам стварэння новых наркаматаў, з улікам расшырэння аб'ёму гаспадарчага кіраўніцтва саюзных рэспублік. Мы павінны будзем распрацаваць новае размежаванне праў і абавязкаў паміж саюзным бюджэтам, рэспубліканскімі і мясцовымі бюджэтамі ў першай палове 1937 года, каб з самага пачатку ўсю падрыхтоўку да бюджэта 1938 года весці на аснове новага палажэння.

Многія таварышы, у прыватнасці Наркамзем Беларусі тав. Бенек і інш., гаварылі аб недастатковай упарадкаванасці фінансавай работы ў зямельных органах. Гэта правільна. Адной з сур'ёзных арганізацыйна-фінансавых задач 1937 года з'яўляецца навядзенне парадку ва ўсёй фінансавай гаспадарцы соўгасаў і МТС. Нам трэба дабіцца дакладнага размежавання асігнаванняў паміж асобнымі сістэмамі соўгасаў і МТС, паміж асобнымі галоўнымі кіраўніцтвамі Наркамземаў і наркамсоўгасаў і павесці больш суровы падлік грошай.

Далей тав. Грынько падкрэслівае неабходнасць рэзка ўзняць культуру работы фінансавых органаў у 1937 г. За апошнія гады, — гаворыць ён,—мы значна падцягнулі ашчадныя касы, падпягнулі таксама раённыя аддзяленні дзяржаўнага банка. Нам трэба пяпер паставіць пытанне аб культурнай рабоце саміх фінансавых органаў і ў першую чаргу **раённага фінансавага аддзела.**

Раённы фінансавы аддзел павінен стаць узорнай дзяржаўнай установай ва усіх адносінах.

— Таварышы, — гаворыць тав. Грынько ў заключэнне,—дзяржаўны бюджэт знайшоў сваё адабрэнне на сесіі ЦВК СССР. Сёння ён будзе зацверджан і стане законам для нашай краіны на 1937 год. Мы абмяркоўваем дзяржаўны бюджэт, як велізарную задачу, пастаўленую партыяй і ўрадам перад усёй краінай на 1937 г.

Абавязкам усіх органаў улады зверху да нізу з'яўляецца арганізаваць выкананне гэтага дзяржаўнага бюджэта. Мы павінны дабіцца таго, каб велізарны дзяржаўны бюджэт на 1937 год быў выкананы і перавыкананы, каб грандыёзная праграма сацыялістычнага будаўніцтва была прафінансавана поўнасцю і каб у рэзультаце выканання дзяржаўнага бюджэта і ўсёй фінансавай праграмы 1937 г. совецкі рубель стаў яшчэ больш моцным. **(Апладысменты).**

ПРАМОВА тав. Я. І. ЛАСТОЎСКАГА

(Пастаянны прадстаўнік БССР пры ўрадзе Саюза ССР).

Даклад народнага камісара фінансаў Саюза ССР тав. Грынько з усёй яснасцю пацвярджае, што 1936 год быў годам выдатных перамог і дасягненняў нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Штогод да сесіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР мы прыходзім з велізарным прыростам бюджэта. Бюджэт 1937 года на 17,3 проц. больш леташняга. Рост нашага бюджэта характарызуе тое гіганцкае прасоўванне наперад, якое мы маем на ўсіх без выключэння участках сацыялістычнага будаўніцтва. Наш бюджэт аллюстроўвае ўсю поўнакроўнасць сацыялістычнай эканомікі, нашай совецкай культуры, ён адпавядае ўсім патрабаванням узрастаючых культурных патрэбнасцей мас краіны Советаў. Бюджэт 1937 года з усёй паўнатой намячае ажыццяўленне далейшых мерапрыемстваў па ўмацаванню абароназдольнасці нашай сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Прайшоўшы 1936 год для БССР з'яўляўся такім-жа годам пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва, якім ён быў для ўсяго Совецкага Саюза. Беларусь прышла на сесію ЦВК СССР з датэрміновым выкананнем гадавога плана прамысловасці.

Не адстала Беларусь і ў выкананні фінансавага плана. Перавыкананне фінансавага плана дало магчымасць своечасова і поўнасцю прафінансаваць усе мерапрыемствы 1936 года як у галіне прамысловасці, комунальнай гаспадаркі, так і ў галіне сацыяльна-культурнага будаўніцтва.

У аснову выканання бюджэта БССР лягла барацьба за фінансавую дысцыпліну, за моцны совецкі рубель, за поўнае паступленне ў бюджэт ўсіх прадугледжаных бюджэтам падаткаў і даходаў як ад абагуленага сектара, так і ад насельніцтва. Гэту барацьбу вялі не толькі фінансавыя органы, — у яе былі ўцягнуты грамадскасць, друк, комсамол і, у першую чаргу, масавыя органы советаў — секцыі і дэпутацкія групы. Дзякуючы такой мабілізацыі мы перавыканалі свой бюджэт па даходу больш чым на 30 млн. руб. СНК Саюза дазволіў нам дадаткова скарыстаць каля 10 млн. руб. на комунальныя і сацыяльна-культурныя патрэбы рэспублікі.

З гэтымі дасягненнямі мы ўступілі ў 1937 год — год новых перамог і поспехаў. Бюджэт 1937 года, дзяржаўны і мясцовы бюджэт БССР дасягаюць у гэтым годзе 918,8 млн. руб. Ён больш леташняга амаль на 120 млн. руб. Толькі на сацыяльна-культурныя мерапрыемствы ў гэтым годзе асігнуецца 665 млн. руб.— на 165 млн. больш, чым у мінулым годзе.

Неабходна адзначыць, што побач са значнымі асігнаваннямі на гаспадарчае і культурнае будаўніцтва ў нашым бюджэце прадугледжаны значныя сродкі на якаснае палепшэнне работы нашых школ, вышэйшых навучальных устаноў, лекавых устаноў, дзіцячых садоў, яслей і т. д. Мы ўзнімемся ў 1937 годзе на новую высокую ступень у справе задавальнення культурных запатрабаванняў працоўных, у справе ўздыму іх матэрыяльнага ўзроўню. У 1937 годзе рабочыя і калгаснікі і ўсе працоўныя Беларусі будуць жыць яшчэ лепш, яшчэ весялей.

Спынімся на нашым нізавым звяне — сельскім бюджэце. У 1936 годзе сельскі бюджэт у нашай краіне дасягнуў велізарнай сумы — каля 2,5 мільярда руб. У 1937 годзе ён павышаецца яшчэ на некалькі соцень мільёнаў рублёў. Больш паловы гэтых сродкаў ідзе на культурнае будаўніцтва, на патрэбы нашых школ, хат-чыталень, больніц. У Беларускай рэспубліцы налічваецца каля 1,5 тыс. сельскіх бюджэтаў з сумай, якая дасягае амаль 70 млн. руб. У абмеркаванні гэтых сельскіх бюджэтаў прымалі ўдзел тысячы калгаснікаў, але гэтага далёка недастаткова.

Трэба ставіць сваёй задачай, каб у абмеркаванне бюджэта поўнасцю былі ўцягнуты ўсе калгаснікі.

У БССР за 9 месяцаў мы здолелі абрэвізаваць і праінструктаваць у сярэднім па два з лішнім разы нашы сельсоветы. Але гэтага мала. Неабходна прыняць, як правіла, што рэвізія і інструктаванне сельсоветаў павінны праводзіцца не радзей як адзін раз у тры месяцы, і трэба больш прыцягваць да гэтай работы калгаснікаў.

У мінулым і ў гэтым годзе значныя асігнаванні па бюджэту атрымалі нашы раённыя цэнтры. Трэба сур'ёзна падумаць, як скарыстаць гэтыя сумы, каб кожная сотня і тысяча рублёў была-б скарыстана разумна, не пайшла-б на іншыя і менш важныя, непатрэбныя мерапрыемствы. Гэтыя асігнаванні павінны значна палепшыць добрабыт раённых цэнтраў, пачынаючы з памяшкання самога райвыканкома і канчаючы прывядзеннем у парадзе тратуараў, маставых і іншых прасцейшых мерапрыемстваў.

Тав. Ластоўскі закончыў сваю прамову наступнымі словамі:

— Я выказваю выключную ўпэўненасць усіх нас, тут прысутных, што бюджэт Саюза ССР, не гледзячы на яго калосальны аб'ём, будзе не толькі выканан, але і перавыканан. Ён будзе ажыццёўлен таму, што кожны артыкул гэтага бюджэта зусім даступны і зразумелы кожнаму працоўнаму. Адным з папулярнейшых артыкулаў нашага бюджэта з'яўляецца артыкул расходаў на абарону нашай чароўнай сацыялістычнай радзімы. Працоўныя нашага Саюза ні на адну мінуту не збываюць пра небяспеку, якая ім пагражае. Як ніколі, яны будуць аберагаць сваю Сталінскую Канстытуцыю! Народы нашага вялікага Саюза ніколі і нікому не дазволяць парушаць свае шчаслівае і радаснае жыццё! **(Апладысменты).**

Алесь СТАХОВІЧ

У карчэўі

(Апавяданне)

У гэты дзень Юльян Кірылавіч прачнуўся рана. Ён хутка насунуў стаяўшыя ля ложка боты, апрануўся ў піджак, зашпіліў патранташ і зняўшы са сцяны сваю стрэльбу, пераступіў парог.

— Лягаш! — прабасіў ён, ступаючы па ганку.

З-пад сенцаў выскачыў жвавы тонканогі сабака з доўгімі абвіслымі вушамі. Ён завіляў хвастом і, абнюхаўшы боты, адразу кінуўся на грудзі гаспадару.

Юльян палашчыў Лягаша, і яны выйшлі за вароты.

Надвор'е было ціхае. Над белай пушыстай коўдрай клубіўся шэры туман, раз'ядаючы першыя сняжынкі.

Лягаш, было, панёсся па вуліцы, але Юльян звярнуў на загуменне і ён, перакочыўшы плот, падаўся за ім.

За свае 60 гадоў ён скалясіў усю тутэйшую мясціну і кожны кусцік раскінутага хмызняку быў вядомы яму. Ведаў ён і зайчыя лаўжы і тыя патаемныя нізінкі, дзе на сонцы прыграваліся яны.

Колькі год таму гэты хмызняк, як і ўсе навакольныя прыгоды, належалі пану Свіршчэўскаму. Тады не ступала тут Юльянава нага. Хадзіў сюды на паляванне толькі сам Свіршчэўскі з высокім і тонкім, як жэрдка, папом, ды яшчэ з лысым шыракаплечым, з вялікай, як памяло, барадою, валасным старшыной. І была ў іх на ўскраіне недалёка ад вёскі аблюбаваная, абросшая елянцам, мясціна, дзе сілкаваліся яны пасля палявання.

Аднаго разу не паладзілі яны з-за пейкага недабітага зайца. Стралялі яны па таму зайцу ўтрох, а хто папаў — было цяжка ўявіць. А толькі поп увесь час напіраў, што ён, а ніхто іншы трапна стрэліў, і заяц належыць яму. Спачатку яны спрачаліся ціха, а калі распілі віно, завязалася ў іх страшэнная тузаніна.

Валасны старшына хлабысну́ў папа па карку, а той схапіў за нагу растрыбушанага зайца ды ўляпіў яму ў твар. Поп рынуўся аб корч. У гэту трапную хвіліну старшына падскочыў да яго, рукамі ўпіўся ў яго доўгую грыву і, праклінаючы госпада бога, пацягнуў на раллю.

Пан Свіршчэўскі, нібы спавіты, стаяў ля арэшыны. Ён спачатку рычэў на абодвух, а затым схапіў ружжо і, хістаючыся ў бакі, кінуўся наўцёкі. Яго абамлелыя ногі цапляліся за ламачча, і ён, спаткнуўшыся, пакаціўся ў раўчак.

Доўгі час ён валяўся, рычэў у карчэўі, а паджарая грудастая сучка лізала ягоны абрыганы твар.

***

У гушчары яўкнуў сабака. Юльян суняўся і, узвёўшы курок, прысеў за кустом, пільна ўглядаючыся ў невялічкую, запарошаную снегам, прагаліну.

Наўкола было ціха. Толькі дзесьці на дрэўцы цвіркала маленькая птушка. Лягаш праімчаўся з боку і, відаць, страціўшы след, закружыўся, зарыскаў ля ламачча.

Юльян узняўся з-за куста і асцярожна рушыўся наперад.

У гушчарах раптам хруснула сухавіна. Лягаш задраў галаву, зачмыхаў у ноздры, яўкнуў і зноў зарыскаў у кустах.

Юльян настарожыўся:

«Каго-ж, нляліха, загнала сюды?» — падумаў ён і, трымаючы стрэльбу, пачаў грабіраппа ў кусты.

З гушчароў тарканулася состаць чалавека і зноў падалася назад. Гэта яшчэ больш кранула Юльяна і ён, не зводзячы вачэй з таго месца, спяшаўся туды.

— От, чорт, — бубніў ён пра сабе, — туляецца. Ці не з таго боку?

Чалавек цёрся ля ялінак, адыходзячы ў бок.

Юльян прыбавіў шагу і, падазраўшы Лягаша, пусціўся ўдагон.

— Не падыходзь, застрэлю! — прыпушаным голасам прыгразіў уцякач, хаваючыся за дрэва.

Юльян суняўся. Цяпер ужо зусім яму было зразумела, на каго натрапіў ён у гэтым карчэўі.

— Ухадзі! — зноў пачуўся жахлівы голас з-за дрэва.

— Юльян не адступае! — паважна заявіў Юльян і, трымаючы стрэльбу напагатове, сурова загадаў:

— Рукі ўгору!

Над галавою ў старога свіснула кула і зноў залязкаў рэвальвер.

Юльян прыхінуўся за вывернуты корч і, спрытна нацэліўшы стрэльбу, выпаліў зарад.

За дрэвам калыхнулася мясістая постаць і, ойкнуўшы, цяжка рынулася на снег.

Юльян Кірылавіч падхапіўся з-за карча і падаўся да дрэва. Было відаць, што ўлапіў Юльян яму ў самую кісць правай рукі, і новы рэвальвер адляцеў у снег.

— Адпусці! Адпусці, дзед! — падпаўзаючы да ног старыка, падвізаўся падбіты.

— Адпусці! Я азалачу цябе. У мяне вось тут...

Тымчасам ён прыцягваў сваю левую руку, цэліўшы схапіць старога за штаніну і падкамшыць пад сябе.

— Ты, падла, не цэлься. Са мною жарты кепскія. Прыкончу, і баста.

Перабежчык падагнуў калені і на момант замоўк. А калі Юльян нахінуўся падымаць ляжаўшы ў баку рэвальвер, ён спружынай кінуўся на яго. Але стары паспеў прыкладам стукнуць яго ў лоб, і ён зноў, як бык ад удару, рынуўся на снег.

Лягаш ускочыў на яго і пачаў тармашыць за адзежыну.

— Ах ты, гадзюка аканная. А ну, падымайся.

Перабежчык, прыкідваючыся, ляжаў нерухома.

— Падымайся, гавару, — закладваючы патрон у двухстволку, зноў сурова загадаў стары.

Мясістая постаць павольна падымалася на ногі.

— Рукі ўгору! Прама! На прагаліну! Аслеп, ці што? — камандзіраў Юльян, моцна трымаючы стрэльбу.

Перабежчык увесь час імкнуўся загінаць да гушчароў.

— Куды цягнеш? — выпраўляў стары хаду перабежчыка.

— На дарогу! Ну!

Каржакаваты перабежчык павольна крочыў па дарозе, пазіраючы ў бок абросшай кустамі граніцы.

— Ты, паніч, прыбаўляй шагу, бо чалавек я не гуляшчы, — падыходзячы да калгаснай сядзібы прапанаваў Юльян.

З прасторнага двара неслася рыжая парка, і падкованыя санкі рыпелі на снягу.

— Гэ-э-э... паніч... адведаць падумаў, — пазнаўшы Свіршчэўскага сына, здзіўлена прагаварыў Максім. — Ну, вось і пачаставаў цябе Юльян, — з усмешкаю на твары прадаўжаў ён.

— А цяпер мы пагаворым з табой.

Яны узвалілі яго на санкі і панесліся ў заставу.

„ЧЛЕН ПАРТЫІ НАВУЧАЕЦЦА І ПАВІНЕН НАВУЧАЦЦА НА ПАРТЫІНЫМ СХОДЗЕ НЕ МЕНШ, КАЛІ НЕ БОЛЬШ, ЧЫМ У ПАРТЫІНАЙ ШКОЛЕ“

Л. М. КАГАНОВІЧ

УЗНЯЛАСЯ ЯКАСЦЬ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ПАРТСХОДАЎ

У 1935 годзе ў партарганізацыі завода «Большавік» было праведзена ўсяго 14 агульназаводскіх партсходаў, значная частка якіх былі адкрытымі. У 1936 годзе было 28 агульназаводскіх партсходаў, з іх 3 адкрытых. Такім чынам, роля агульназаводскіх партсходаў значна павялічылася (у 1936 годзе амаль у два разы больш супроць 1935 года). Гэта, безумоўна, станоўчае з'явішча, бо ў нашых умовах, пры наяўнасці параўнаўча невялікай колькасці комуністаў у пярвічных партарганізацыях, з'яўляецца зусім няправільным тэндэнцыя асобных партарганізацый абмежаваць ролю агульназаводскага партсхода.

І не толькі колькасць, але, галоўнае, якасць саміх партсходаў значна палепшылася. Возьмем, напрыклад, абвестку дня партсхода ад 17 лістапада 1935 года. На гэтым партсходзе на абмеркаванне былі пастаўлены наступныя тры пытанні:

1) Пастанова ЦК ВКП(б) аб школе; 2) аб выніках работы школ партасветы за 1935 год і план партвучобы на 1936 год; 3) аб рабоце нізавога друку. Зусім зразумела, што такая абвестка дня ні ў якім разе не магла забяспечыць сур'ёзнае і актыўнае абмеркаванне. Сход ледзь мог справіцца з абмеркаваннем аднаго з гэтых пытанняў.

Несумненна, што праверка і абмен партдакументаў значна садзейнічалі ўздыму ўсёй унутрыпартыйнай работы ў партарганізацыі і ўзнялі якасць партыйных сходаў. Значна палепшылася падрыхтоўка і ідэйны ўзровень партсходаў. Станоўчым у партарганізацыі завода «Большавік» з'яўляецца тое, што ў абвестцы дня агульных партсходаў у куды большай ступені з'явілася пытанне з унутрыпартыйнага жыцця партарганізацыі (на трох сходах абмяркоўваліся пытанні партвучобы і работы прапагандыстаў, адзін партыйны сход быў спецыяльна прысвечан захаванню партдакументаў, на радзе партыйных сходаў ставіліся інфармацыі аб выкананні рашэнняў папярэдніх партсходаў і т. д.). Прывядзем некалькі прыкладаў праведзеных партсходаў у 1936 годзе.

18 красавіка быў праведзен партдзень аб захаванні комуністамі партдакументаў. Пастаноўка гэтага пытання была выклікана наступнымі прычынамі: у партгрупе першага хромавага цэха член партыі Шустэр згубіў свой партбілет. Пры абмеркаванні гэтага пытання на партгрупе выяснілася, што пэлы рад комуністаў няўважна адносяцца да захавання партдакументаў (пакідаюць партбілет у кішэні паліто, якое застаецца ў раздзявалцы і т. д.). Парткамітэт, абмяркоўваючы гэта пытанне, рашыў паставіць яго на агульназаводскім партсходзе, папярэдне правёўшы масавую праверку захавання комуністамі партдакументаў. Да гэтай работы была прыцягнута група комуністаў, якая рыхтавала гэта пытанне да партыйнага схода. Да партыйнага схода ўсе комуністы калектыўна былі ў кіно і праглядзелі карціну «Партбілет».

Партсход па гэтаму пытанню прайшоў даволі актыўна, рад выступаўшых указвалі на канкрэтныя прыклады нядбайных адносін некаторых комуністаў да захавання партдакументаў і якія вынікі комуністы павінны для сябе зрабіць.

Надзвычай паказальным з'яўляецца таксама партыйны сход 20 чэрвеня 1936 года па пытанню аб выбары сакратара парткома. Звычайна такое пытанне ў радзе партарганізацый праходзіць без дастатковай актыўнасці членаў партыі, без спрэчак — звычайным галасаваннем. Не так аднесліся да гэтага важнейшага пытання ў партарганізацыі завода «Большавік». Вакол гэтага пытання і кандыдатуры сакратара парткома разгарнуліся спрэчкі — выказалася 19 членаў партыі. Гэты партсход з'явіўся сведчаннем значна ўзрослага палітычнага ўзроўню комуністаў і сур'ёзнага, удумлівага падыходу пры рашэнні такога важнейшага пытання, якім з'яўляюцца выбары сакратара парткома.

Гэтыя два прыклады сведчаць аб тым, што ў партарганізацыі завода «Большавік» несумненна лепш пачалі рыхтаваць партсходы, ідэйны ўзровень якіх безумоўна павысіўся.

Аднак гэта яшчэ не азначае, што ўсе партсходы ў партарганізацыі праводзяцца на высокім ідэйным узроўні. Нельга таксама сказаць, што пытанне аб партыйных сходах пастаўлена ў цэнтры ўвагі ўсёй унутрыпартыйнай работы. Наадварот, у партарганізацыі ў галіне правядзення партсходаў ёсць яшчэ рад буйнейшых недахопаў. Адным з буйнейшых недахопаў з'яўляецца тое, што партком на працягу ўсяго 1936 года ні разу не адчытваўся на партсходзе аб сваёй рабоце, што з'яўляецца грубейшым парушэннем унутрыпартыйнай дэмакратыі. Не ўведзена ў сістэму пастаянная інфармацыя парткома аб выкананні рашэнняў папярэдніх партсходаў (за 1936 год інфармацыі былі толькі на 2—3 партсходах).

Дрэнна пастаўлена работа з цэхавымі парторгамі, ідэйны ўзровень цэхавых партсходаў надзвычай нізкі, праводзяцца яны нерэгулярна. Партком слаба дапамагае цэхавым парторгам і слаба іх інструктуе.

Нават такое элементарнае пытанне, якім з'яўляецца ўчот наведваемасці комуністамі партыйных сходаў, да апошняга часу не было наладжана ў партарганізацыі. На 5 сходах не было 18 комуністаў і партком не толькі не абмеркаваў гэтага пытання на парткоме, але нават не высветліў прычын адсутнічання гэтых комуністаў на партсходах.

Партком завода «Большавік» і сакратар парткома т. Мінкін павінны яшчэ шмат папрацаваць над тым, каб партыйныя сходы сталі сапраўды баявой школай ідэйнай загартоўкі комуністаў.

Э. ЛЕЎСОН.

Менскі гарком КП(б)Б арганізаваў месячныя курсы партыйнага рэзерва. НА ЗДЫМКУ: Заняткі курсаў.

Фото Я. Салавейчыка.

ПРАПАНОВЫ ПАРТЫЙНЫХ РАБОТНІКАЎ ДА ПЛЕНУМА ГАРКОМА КП(б)Б

Тав. БАЛТУКОЎ (парторг завода буддэталей)

У Менску велізарная большасць дробных пярвічных партарганізацый. З агульнай колькасці каля 350 пярвічных партарганізацый — 192 (гэта значыць каля 55 проц.) налічваюць да 10 членаў і кандыдатаў партыі. Між тым гарком і горрайкомы вельмі слаба займаюцца канкрэтнай дапамогай гэтым арганізацыям. Напрыклад, у пярвічнай партарганізацыі мы за два гады не бачылі члена бюро або інструктара гаркома і горрайкома на партыйным сходзе. Думаю, што пленум гаркома звярнуў увагу на неабходнасць большай дапамогі і сувязі з боку гаркома і горрайкомаў дробным партарганізацыям.

Тав. МЯДЗВЕДЗЕВА— парторг цэха фабрыкі „Комунарка“

Пытаннем кіраўніцтва і дапамогі цэхавым партарганізатарам у правядзенні партыйных сходаў гарком займаўся вельмі слаба. 7 студзеня ў нас у карамельным цэху на цэхавым партсходзе ўдзельнічаў сакратар гаркома т. Рыскін. Апрача таго я ўдзельнічала на нарадзе ў гаркоме па абмену вопытам правядзення партдзён і на бюро гаркома 9 студзеня, калі адчытваўся аб партднях наш сакратар парткома т. Рабкін.

Гэта мне, як цэхаваму парторгу, вельмі многа дало ў маёй практычнай рабоце. Калі гарком і Сталінскі горрайком не толькі перад пленумам, а штодзенна займаліся-б дапамогай цэхавым парторгам, удзельнічалі-б на цэхавых партсходах— узровень цэхавых партсходаў быў-бы куды вышэйшы, чым у сучасны момант.

Прапаную гаркому і горрайкому рэгулярна склікаць нарады цэхавых парторгаў для абмену вопытам правядзення цэхавых партсходаў.

Тав. СУРАЖЫНСКІ (сакратар парткома трампарка)

У вытворчых пэртарганізацыях партыйныя сходы звычайна назначаюцца адразу пасля работы. Гэта знижае ўзровень партыйных сходаў, так як некаторыя комуністы думаюць над тым, як-бы хутчэй скончыўся сход і можна было пайсці дадому пазбедаць і адпачыць. Апрача таго, часта комуністы прыходзяць на сход не памыўшыся, у спецвопратцы, памяшканне аказваецца няўбраным, што не стварае неабходных культурных умоў для правядзення партыйных сходаў.

Прапаную агульнафабрычныя партыйныя сходы, як правіла, праводзяць не адразу пасля работы, а з перапынкам на 2—3 гадзіны, каб на партсход комуністы з'явіліся адпачнуўшы, што безумоўна павысіць якасць партсходаў.

Тав. КАЧАН—член пленума гаркома (электрастанцыя)

Гарком недастаткова прыцягвае членаў пленума гаркома да выканання канкрэтных партыйных даручэнняў і ўдзелу ў практычнай рабоце гаркома. Па-мойму, адным з важнейшых мерапрыемстваў маглі быць даручэнні членам пленума ўдзельнічаць на партыйных сходах пярвічных партарганізацый. Гэта дало-б магчымасць членам пленума ведаць работу не толькі сваёй партарганізацыі, а і ставіць перад бюро гаркома рад пытанняў, якія выцякаюць з работы іншых партарганізацый. Прапаную больш прыцягваць членаў пленума гаркома да практычнай работы гаркома.

Тав. БРУДНЕР (сакратар парткома фабрыкі імя Куйбышэва)

Пры падрыхтоўцы да пленума гаркома па пытанню аб партыйных сходах гарком правёў вялікую работу і сабраў багаты матэрыял. Найбольш характэрным у гэтай справе з'яўляецца прыцягненне гаркомам да прапрацоўкі матэрыялаў к пленуму групы нізавых партработнікаў. Я, як сакратар парткома, удзельнічаў на працягу апошняга месяца на двух нарадах у гаркоме, дзе апрача абмену вопытам правядзення партсходаў я прыняў таксама актыўны ўдзел у разборы матэрыялу аб выніках партсходаў.

Я павінен прама заявіць, што ўдзел сумесна з членамі бюро гаркома і іншымі партработнікамі ў разборы і абмену вопытам правядзення партсходаў у нашай менскай партарганізацыі дало мне вельмі многа ў маёй практычнай рабоце.

Таму я прапаную і ў будучым практыкаваць перыядычна такія нарады па абмену вопытам правядзення партсходаў. Прычым гарком і горрайкомы павінны гэтыя нарады праводзіць дыферэнцыявана па асобных групах (вытворчыя, совецкія, вузаўскія).

На гэтых нарадах не варта абмяжоўвацца толькі інструктаваннем (вярней «накачкай»), як гэта мела месца ў большасці выпадкаў да гэтага часу, а больш усяго трэба праводзіць іх пад кутом гледжання сур'ёзнага абмену вопытам на аснове аналіза работы як асобных пярвічных партарганізацый, так і па раёну ў цэлым.

Гэта безумоўна дапаможа значнаму паляпшэнню якасці і ідэйнага ўзроўню партсходаў.

СТЫЛЬ РАБОТЫ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ

7 студзеня было намечана правесці партыйны сход партарганізацыі электрастанцыі з парадкам дня: «Аб практыцы правядзення партыйных сходаў». Здавалася, што падрыхтоўцы да гэтага схода партком напаўна павінен быў аддаць асаблівую ўвагу. На жаль, гэтага зусім не было.

Для таго, каб не быць галаслоўнымі, прывядзем факты. 2 студзеня на пасяджэнні парткома абмяркоўвалася пытанне аб падрыхтоўцы да гэтага схода. Партком па інфармацыі тав. Самуйлава (сакратар парткома) выносіць пастанову такога фармальнага зместу: «Выдзеліць 2 групы па 3 чалавекі, адна група ў складзе т.т. Розіна, Кантаровіча і Шпака— правяраць партгрупу машынна-кацельнага цэха і другая група — т.т. Горн, Дашынскі, Дрывоцін правяраюць партыйную арганізацыю. Адказныя т.т. Розін і Горын».(?!).

У гэтым і выявілася ўся падрыхтоўка да партыйнага схода. Вылучаныя камісіі не былі праінструктаваны. Яны не атрымалі ніякага напрамку ў рабоце, ім ніхто не растлумачыў, чым яны павінны займацца і што правяраць.

Цікава, што на партсходзе справаздачу аб тым, як падрыхтоўваюцца партыйныя сходы рабіў не сакратар парткома, а камісіі. Не дзіва, калі комуністы ўвесь агонь крытыкі накіравалі на работу камісіі, а не на работу парткома і яго сакратара тав. Самуйлава.

Такое абмеркаванне гэтага пытання на сходзе мела свой адбітак і на якасць рашэння. Так, у першым пункце сход канстатуе: «Сходы партарганізацыі праходзілі на дастаткова ідэйна-палітычным узроўні». І тут-жа ніжай гаворыцца аб тым, што падрыхтоўка да сходаў праводзілася недастаткова. Зусім зразумела, што такая алілуйская пастанова наўрад ці забяспечыла ўзняцце значэння партсхода на належную палітычную вышыню.

Аб стылі работы гэтай партарганізацыі можна меркаваць і з таго, як пастаўлена работа па праверцы выканання рашэнняў партыйных сходаў. На партыйным сходзе 27 снежня ў ліку іншых 5 пытанняў парадку дня абмяркоўвалася пытанне аб праверцы выканання. Як стаіць справа з гэтым важнейшым пытаннем унутрыпартыйнага жыцця можа характарызаваць інфармацыя самога сакратара парткома тав. Самуйлава. Тав. Самуйлаў заявіў: «Партыйны камітэт не выконвае рашэння партсхода аб інфармацыі па выкананню рашэнняў партсходаў. Апошняя інфармацыя была 2 месяцы таму назад». І такая, з дазволу сказаць, «інфармацыя» сакратара не выклікала абурэння партсхода. Нават па гэтаму пытанню ніхто не выступіў.

Пасля такога «абмеркавання» інфармацыі сакратара парткома тав. Самуйлава зусім не здзіўляе нас і «мудрае» рашэнне, прынятае сходам аб тым, што «пытанне з парадку дня трэба зняць у сувязі з тым, што матэрыялы ўстарэлі».

Усё гэта сведчыць аб нізкім узроўні ўсёй арганізацыйна-партыйнай работы ў гэтай партарганізацыі.

ГУРАЛІС.

Сходы праходзяць без падрыхтоўкі

У нашай партыйнай арганізацыі партыйныя сходы не з'яўляюцца школай выхавання комуністаў. За апошнія тры месяцы ў нас наогул паслабла ўнутрыпартыйная работа. Агульныя партыйныя сходы праходзяць нецікава, сумна, таму, што комуністы не рыхтуюцца да іх. І як рыхтавацца, калі аб партыйным сходзе, звычайна даведваемся толькі ў дзень схода?!

Аб парадку дня схода мы даведваемся толькі з вуснаў старшыні сходз. Для таго, каб комуніст мог прыняць актыўны ўдзел у партыйным сходзе, трэба, каб ён загадзя ведаў парадак дня і падрыхтаваўся-б да яго.

Не арганізована ў нас і праверка выканання. Комуністы не ведаюць, як выконваецца тое ці іншае рашэнне схода.

РОЗІНА, КАГАН, КАНЕР.
Фабрыка «Чырвоны тэкстыльшчык».

ПАРТКОМ І ПАРТЫІНЫЯ СХОДЫ

Сакрэтар партыйнага камітэта завода «Чырвоная зорка» тав. Гурэвіч на пытанні, як партком рыхтуе абвестку дня партсхода і як прыцягваюцца да ўдзелу ў падрыхтоўцы сходз комуністы, вымушан быў прызнацца, што партыйны камітэт наогул не абмяркоўвае пытанні абвесткі дня партыйнага схода.

Сапрэўды, уся падрыхтоўка да партыйнага схода зводзіцца да таго, што ў плане работы пярвічнай арганізацыі памячаецца, калі правесці сход і з якой абвесткай дня.

На партыйных сходах ставіцца па чатыры і больш пытанняў. Бываюць выпадкі, калі ставяцца пытанні непрынцыповага значэння.

Так, 17 мая на партыйным сходзе заслухалі больш чатырох пытанняў: справаздачу старшыні першамайскай камісіі аб ліквідацыі непісьменнасці, аб тэхнічнай вучобе, аб разгортванні фізкультурнай работы і інш. Па пытанню аб фізкультурнай рабоце прынялі наступнае рашэнне: «Абвязаць заўком абмеркаваць гэта пытанне на сходзе фізкультурнікаў». Зусім зразумела, што такія абвесткі дня нічога не даюць для ідэйнага выхавання комуністаў. Гэта абычная абвестка дня для пасяджэння заўкома.

Бываюць і асобныя выпадкі, калі пілкага рашэння не прымаюць. Так, на партыйным сходзе ад 29 лютага слухалі пытанне «аб правядзенні стаханаўскага двухдэкадніка». У кнізе пратаколаў пакінута месца для пастановы. Аднак пастанову так і не аформілі і да гэтага часу.

Не рыхтаваліся і да партыйнага схода, які адбыўся 7 снежня. Яго рыхтаваў толькі сакратар парткома. Зусім зразумела, што пры калектыўным абмеркаванні абвесткі дня партком не дапусціў-бы, каб на партыйным сходзе спачатку ставілі індывідуальную справаздачу тав. Граковіча, а пасля разбіралі яго заяву аб пераводзе яго з кандыдатаў у члены партыі. У рэзультаце, такая сур'ёзная справа як прыём у партыю на партыйным сходзе была змазана.

Адно можна сказаць, што партыйныя сходы на заводзе «Чырвоная зора» не сталі яшчэ школай выхавання комуністаў.

Гэтага, як відаць, не зразумеў яшчэ партыйны камітэт завода «Чырвоная зора».

РОБЕРМАН.

І. М. ОФЕНГЕЙМ.

ПАРТЫЙНЫ СХОД—ШКОЛА БОЛЬШЭВІЦКАГА ВЫХАВАННЯ

Роля партыйнага схода ў справе большэвіцкага выхавання комуністаў—велізарная. Тав. Кагановіч на XVII партыйным з'ездзе гаварыў: «Член партыі навучаецца і павінен навучацца на партыйным сходзе не менш, калі не больш чым у партыйнай школе».

Несумненна, за апошнія гады значна ўзнялася роля партыйнага схода. У радзе пярвічных партыйных арганізацый пачалі значна лепш падрыхтоўвацца да партыйнага дня. Абвесткі дня сталі больш змястоўнымі. Пытанні ўнутрыпартыйнага жыцця становяцца асновай абвестак дня. Пры ўсім гэтым нельга сцвярджаць, што падрыхтоўка і правядзенне партыйных сходаў пастаўлены на такім высокім ідэйным узроўні, які патрабуе ад нас партыя на даным этапе. Ёсць шматлікія факты, якія паказваюць зусім дрэнную падрыхтоўку партыйных сходаў з боку раду парткомаў і парторгаў. Прычым гэта адносіцца не толькі да дробных і сярэдніх прадпрыемстваў, але і да раду буйных партарганізацый Менска.

Партарганізацыя завода імя Варашылава дрэнна падрыхтоўвае партыйныя сходы. Гэта прыводзіць да таго, што комуністы не ведаюць абвесткі дня схода, а некаторыя ў сувязі з дрэнным апавяшчэннем зусім не прысутнічаюць на партыйных сходах. Так, звычайна ў гэтай партарганізацыі лічыцца нармальным, калі на кожным партыйным сходзе адсутнічае ад 8 да 15 членаў і кандыдатаў партыі.

Выключна безадказна пастаўлена афармленне пратаколаў у гэтай партарганізацыі. З 12 пратаколаў партыйных сходаў 7 не маюць рашэнняў па абмяркоўваных пытаннях абвесткі дня. Асобныя пратаколы на працягу раду месяцаў усё яшчэ афармляюцца, а частка рашэнняў зусім прапалі. Зусім зразумела, што партыйныя сходы ў гэтай партыйнай арганізацыі не сталі яшчэ сапраўднай большэвіцкай школай выхавання комуністаў. Вось водгукі асобных комуністаў аб падрыхтоўцы сходаў на заводзе імя Варашылава. Член партыі тав. Рубінштэйн гаворыць: «Кожны член партыі павінен ведаць абвестку дня за 2—3 дні раней. Гэтага ў нас няма. Якія пытанні будуць абмяркоўвацца, мы даведваемся толькі непасрэдна на партыйным сходзе». Другі член партыі тав. Райціс гаворыць: «Партком і ўсе мы працуем без плана. Скрозь і ўсюды партсходы назначаюцца раптам, без папярэдняй падрыхтоўкі».

Такое-ж становішча мы маем у партарганізацыі вышэйшага педагагічнага інстытута. Як вядома, гэта партарганізацыя была вельмі засмечана контрэволюцыйнымі трацкісцка-зіноўеўскімі элементамі, якія былі выкрыты без удзелу партыйнай арганізацыі. Ад партарганізацыі патрабуецца сапраўдная большэвіцкая пільнасць, якая можа быць дасягнута толькі на падставе ўздыму ўсёй унутрыпартыйнай работы. Між тым гэта зусім не ўлічана партыйнай арганізацыяй. Узровень партыйнай работы тут застаецца зусім нізкі. На партыйных сходах займаюцца агульнай балбатнёй аб пільнасці, у той-жа час не бачаць, як арудуюць у іх пад носам ворагі народу. Пытанні да партыйных сходаў не падрыхтоўваюцца. Комуністы не ўцягваюцца ў папярэднюю падрыхтоўку абвесткі дня, у выніку ўзровень абмеркавання пытанняў зусім нізкі. Напрыклад, па важнейшаму пытанню — аб рэалізацыі рашэння ЦК ВКП(б) аб вышэйшай школе — на партыйным сходзе гаварылі неканкрэтна, закранулі розныя дробязі, але не асноўныя пытанні і задачы, якія выцякаюць адсюль для партарганізацыі. Такі-ж зместі пастановы партыйнага схода. Не гледзячы на тое, што пастанова гэтага партыйнага схода мае 28 пунктаў, амаль усе яны з'яўляюцца дзяляцкімі. Тут вы знойдзеце і такія пункты: «Замацаваць за факультэтамі пастаянныя аудыторыі», «Паскорыць размножанне стэнограм», «Своечасова прыбіраць памяшканне» і т. д. Як відаць, усе гэтыя пункты менш усяго датычацца партыйнай работы і партарганізацыі. Гэта скарай справа заўхоза інстытута. Затое ў пастанове няма ні аднаго пункта палітычнага зместу, які гаварыў-бы аб задачах партыйнай арганізацыі і кожнага комуніста ў паасобку ў ажыццяўленне гэтага важнейшага дакумента партыі.

У тых партыйных арганізацыях, дзе і праводзіцца падрыхтоўка да партыйных сходаў, план падрыхтоўкі ў радзе выпадкаў не абмяркоўваецца на партыйным камітэце. А там, дзе і ставіцца пытанне падрыхтоўкі да партыйнага схода на партыйным камітэце, у большасці рашэнні па гэтаму пытанню зусім фармальныя.

Не гледзячы на тое, што ў радзе партыйных арганізацый палепшылася якасць абвесткі дня, трэба з усёй рашучасцю падкрэсліць, што ў падборы абвесткі дня мы маем у радзе партарганізацый буйнейшыя недахопы. Асобныя партарганізацыі слаба праяўляюць уласную ініцыятыву ў пастаноўцы сваіх мясцовых пытанняў, карыстаючыся больш за ўсё парадкам дня, рэкамендуемым гаркомам і горрайкомамі. Апошнія ў сваю чаргу займаюцца занадта вялікай апекай пярвічных партарганізацый у сэнсе рэкамендацый парадку дня «адзіных партыйных дзён».

Некаторыя важнейшыя пытанні (пастаноўка палітычнай агітацыі, партыйнай прапаганды, авангардная роля комуністаў у стаханаўскім руху) абмяркоўваюцца зусім недастаткова на агульных партыйных сходах, а некаторымі партыйнымі арганізацыямі яны зусім упускаюцца з поля зроку. Партарганізацыя фабрыкі «Комунарка» на працягу 1936 года ні разу не абмеркавала на агульным партыйным сходзе пытанне аб авангардная ролі комуністаў у стаханаўскім руху, не гледзячы на тое, што кіраўніцтва стаханаўскім рухам пастаўлена дрэнна.

Пытанні, звязаныя з парушэннем членамі партыі статута партыі, партыйнай дысцыпліны, пытанне знясця партыйных спагнанняў з комуністаў ва многіх выпадках ставяцца без іх увязкі з дырэктывамі партыі. Напрыклад, на партсходзе фабрыкі «Кастрычнік» было пастаўлена пытанне аб знясці партспагнанняў з 10 комуністаў. Зусім зразумела, што такі падыход да такой важнейшай справы не забяспечыў прынцыповае яго вырашэнне. Такое-ж становішча мы маем і ў іншых партыйных арганізацыях.

Адным з буйнейшых недахопаў у практыцы партыйных камітэтаў з'яўляецца невыкананне ўказанняў партыі і прамое парушэнне статута, калі партыйныя камітэты не здчытваюцца на партыйных сходах аб сваёй рабоце і не інфармуюць аб выкананні рашэнняў партыйных сходаў. Так, напрыклад, за 1936 год справаздач парткома не было нават у такіх партыйных арганізацыях, як завода імя Кірава, трампарка, завода імя Варашылава і раду іншых. Інфармацыі аб выкананні рашэнняў партыйных сходаў падчас ставяцца фармальна і не сталі сістэмай у рабоце большасці пярвічных партыйных арганізацый.

Сувязь гаркома і горрайкомаў з пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі, асабліва з партыйнымі арганізацыямі совецкіх устаноў, а таксама не вялікіх прадпрыемстваў з'яўляецца зусім недастатковай. Гэта ярка выказаў у сваім выступленні тав. Балтукоў — парторг завода буддэталяў, які на працягу двух год работы парторгам не бачыў у сябе на партыйным сходзе ні прадстаўніка ГК КП(б)Б, ні прадстаўніка Варашылаўскага горрайкома КП(б)Б.

Як гарком, так і горрайкомы ведаюць некалькі дзесяткаў пярвічных партарганізацый, куды часта накіроўваюцца шматлікія камісіі і абследвальнікі, упускаючы з віду так званыя дробныя партыйныя арганізацыі, якія ў Менску складаюць велізарную большасць. Дастаткова сказаць, што большая палова пярвічных партарганізацый налічваюць у сваім складзе ўсяго па 10 і менш комуністаў.

Гарком і горрайкомы павінны ўлічыць гэты асноўны недахоп у сваёй рабоце. Не паслабляючы ўвагу больш буйным партыйным арганізацыям, трэба рашуча павярнуць увагу да дробных пярвічных партарганізацый, аказваючы ім штодзенную практычную дапамогу. Трэба рашуча ўзмацніць увагу пярвічным партыйным арганізацыям.

Заўтра адкрываецца пленум Менскага гаркома КП(б)Б, на абвестцы дня якога пастаўлена пытанне аб партыйных сходах. Неабходна, каб уся работа пленума праходзіла пад кутом разгортвання большэвіцкай самакрытыкі.

Пленум гаркома павінен улічыць палітычныя ўрокі, якія выцякаюць з рашэння ЦК ВКП(б) аб рабоце Растоўскага гаркома ВКП(б).

Усяляк узмацняючы рэволюцыйную пільнасць, упарта прадаўжаючы бязлітаснае выкрыццё контрэволюцыйных трацкісцка-зіноўеўскіх бандытаў і іх пасобнікаў — правых адшчапенцаў, рэстаўратараў капіталізма, партыйныя арганізацыі штодзенным паляпшэннем унутрыпартыйнай работы павінны дабіцца агульнага ўздыму ўсёй партыйнай работы і павышэння большэвіцкай загартоўкі і боездольнасці кожнага комуніста ў паасобку.

Паляпшэнне якасці ідэйна-палітычнага ўзроўню партыйных сходаў, як важнейшага мерапрыемства ў арганізацыйна-палітычнай і ідэйна-выхаваўчай рабоце з членамі партыі, павінна забяспечыць актыўны ўдзел комуністаў у абмеркаванні ўсіх пытанняў партыйнага жыцця, развіцці большэвіцкай самакрытыкі, што з'явіцца важнейшай прадпасылкай у справе ўзняцця сапраўднай большэвіцкай пільнасці комуністаў.

НЕГАРЭЛАЕ

Велізарныя поспехі Совецкага Саюза ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва прыцягваюць да сябе ўвагу іншаземцаў, якія штодзенна прыязджаюць у СССР.

Негарэлае — акно ў Еўропу. Праз Негарэлае едуць у Совецкі Саюз з Англіі, Францыі, Чэхаславакіі, Аўстрыі, Румыніі, Германіі, Швейцарыі. Штодзенна экспрэсы прывозяць дзесяткі і сотні іншаземных пасажыраў.

Прама з вагонаў поезда пасажыры трапляюць у прасторную і светлую рэвізійную залу совецкай мытні. Быстра праходзяць мытныя фармальнасці. Прадстаўнікі «Інтурыста» даюць пасажырам неабходныя даведкі.

Адзін з амерыканскіх турыстаў у гутарцы заявіў:

— Я праехаў праз некалькі іншаземных пагранічных станцый, але такой рэвізійнай залы я яшчэ не бачыў. Калі-б нават прышлося чакаць некалькі гадзін, то ў такім памяшканні прыемна чакаць.

Падобныя выказванні нярэдкі. Іншаземцаў здзіўляе чыстата, культурнае і хуткае абслугоўванне.

Па даных агенцтва «Інтурыст» у Негарэлым у 1936 годзе праехала з заграніцы 4,5 тысячы іншаземных турыстаў. А ўсяго праехала праз Негарэлае 11.000 чалавек. Адных білетаў было прадана звыш чым на поўмільёна рублёў.

Што-ж прадстаўляе з сябе тая маса іншаземцаў, якая ў прайшоўшым годзе праехала ў Совецкі Саюз праз Негарэлае?

Прыязныя адносіны Совецкага Саюза з Чэхаславацкай рэспублікай выклікалі масавы прыезд турыстаў з гэтай краіны. Толькі ў групах з Чэхаславакіі праехала звыш 1.000 чалавек. Зацікаўленасць да Совецкага Саюза ў Чехаславакіі настолькі вялікая, што праязджалі асобныя групы педагогаў, чыгуначнікаў, інжынераў-электрыкаў, трамвайшчыкаў, урачоў, прафесароў рамесніцкіх школ. Некалькі спецыяльных груп арганізавала чэхаславацкае таварыства «Культурай сувязі з СССР».

З Францыі групамі прыбылі 400 турыстаў: французскія кааператары, узначальваемыя старшынёю парыжскага кааперацыйнага аб'яднання Клодыусам Масонам, ехалі знаёміцца з кааперацыйным рухам у СССР; члены муніцыпаліцтэта гор. Вільюрбан знаёміліся з комунальнай гаспадаркай нашых гарадоў; французскія студэнты і педагогі — з пастаноўкай справы народнай асветы.

З іншых краін прыбылі 370 іншаземных турыстаў. Гэта былі: дацкія архітэктары, студэнты вышэйшай тэхнічнай школы з Капенгагена, узначальваемыя прафесарам Суенсам, альпіністы з Германіі і Аўстрыі, групы таварыства «Прыяцеляў Совецкага Саюза» з Швейцарыі і Галандыі.

Вядомы амерыканскі пісьменнік Шэрвуд Эдзі штогодна арганізуе паездкі амерыканцаў у Совецкі Саюз. У жніўні з Амерыкі праязджала вялікая група амерыканскіх грамадскіх дзеячоў у колькасці 75 чалавек.

Зручныя зносіны Заходняй Еўропы з Усходам праз Негарэлае і культурнае абслугоўванне ў совецкім «Транс-Сібірскім Экспрэсе» мела ўплыў на павелічэнне праезду праз Негарэлае транзітных пасажыраў на Манчжурыю. Так, напрыклад, у прайшоўшым годзе праехала на Манчжурыю 1,5 тыс. транзітных пасажыраў розных нацыянальнасцей. Апрача іншаземцаў-адзіночак праязджалі арганізаваныя групы японскіх транзітнікаў у колькасці 90 чалавек.

Праз Негарэлае праязджалі пісьменнікі: Анры Барбюс, Рамэн Ралан, Ліон Фейхтвангер. Прапоўныя станцыі кожны раз цёпла сустракалі і праводзілі сваіх прыяцеляў.

Тут праязджалі міністры заходнеэўрапейскіх краін, паслы дзяржаў. Рэгулярна едуць заклапочаныя дыпламатычныя кур'еры, іншаземныя і совецкія.

Мы сустракаем тут вядомых дырыжэраў — Ото Клемпэрэра, Георга Себасцьяна, Штыдры, віртуоза-піяніста Эгона Петры.

Выязджаюць заграніцу совецкія спартсмены адстойваць спартыўны гонар Совецкага Саюза на футбольным полі, тэнісным пляпоўцы, рынгу, за шахматнай дошкай.

Кожны год на святкаванне гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі і Міжнароднага свята 1 мая прыязджаюць з-за рубяжу вялікія групы іншаземных турыстаў і рабочыя дэлегацыі.

Памятаецца, як у лістападаўскі вечар над гукі аркестра к перону станцыі павольна падыходзіў варшаўскі экспрэс. З вокнаў вагонаў відаць радасныя твары рабочых дэлегатаў. Прывітальныя крыкі, узнятыя да гары кулакі.

Станцыя Негарэлае, якая знаходзіцца на заходняй граніцы Совецкага Саюза, жыве цікавейшым, бурным жыццём.

Іншаземцы праяўляюць жывейшую зацікаўленасць да нашай, поўнай кіпучага будаўніцтва, краіны. Усё гэта прымушае іх прыехаць у краіну, дзе няма крызісаў, няма эксплаатацыі чалавека чалавекам, дзе людзі дыхаюць лёгка і свабодна, жывуць радасным шчаслівым жыццём.

Б. КАМЕННОЎ.

Дэкада грузінскага мастацтва ў Маскве. У Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатры Саюза ССР адбыўся оперны спектакль Тбіліскага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета «Абесалом і Этэры» (музыка З. Паліашвілі). НА ЗДЫМКУ: сцэна з 4 дзеі. На першым плане — заслужаны артыст Д. Андгуладзе ў ролі Абесалома і заслужаная артыстка Е. Сахадзе ў ролі Этэры.

Фото Б. Фішмана. (СФ).

ХАТЫ АБАРОНЫ

Комсамольцы і асоавіяхімаўцы Слуцкай акругі праявілі вельмі каштоўную ініцыятыву. У буйнейшых калгасах, соўгасах МТС акругі пачалася арганізоўвацца хаты абароны. Такіх хат абароны ўжо створана больш дзесяці. Да XIX гадавіны Чырвонай Арміі ў акрузе будзе створана 47 хат абароны. Кожная хата абароны будзе з'яўляцца базай для разгортвання масавай абарончай і фізкультурнай работы сярод калгаснікаў, рабочых соўгасаў і МТС.

Хаты абароны арганізоўваюць комсамольскія і асоавіяхімаўскія первічныя арганізацыі. Пры іх працуюць гурткі — стралковы, конна-спартыўны, ППХА, санітарнай абароны, фізкультурны і інш. Хаты абароны будуць арганізоўваць тактычныя гульні, розныя абарончыя спаборніцтвы, наладжваць чытку лекцый і гутарак аб Чырвонай Арміі, Асоавіяхіме, аб міжнародным становішчы.

Па жаданню членаў асоавіяхіма і калгаснікаў пры хатах абароны могуць быць арганізаваны стралковы пір, спартыўная пляцоўка і ваенна-паляваў гаралок, адкрыты манеж для верхавой язды, абарончая бібліятэка, агітпавозка і т. д. Там, дзе ёсць матэрыяльная база, будуць арганізоўвацца гурткі планерыстаў і будавацца парашутныя вышкі.

У калгасе «Чырвоны пагранічнік», Доўгаўскага сельсовета, Старобінскага раёна для хаты абароны ўжо закуплена шмат дапаможнікаў для вывучэння пропіпаветранай і хімічнай абароны, санітарнай і стралковай справы. Створаны і працуюць розныя абарончыя гурткі. Калгас «Чырвоны вартаўнік» Чырвонаслабодскага раёна для хаты абароны выдзеліў лепшае памяшканне. Памяшканне зараз адраманцавана і прыведзена ў культурны выгляд.

Ініцыятыва комсамольскай і асоавіяхімаўскай арганізацый Случчыны па стварэнню хат абароны заслугоўвае таго, каб яе пашырыць ва ўсіх раёнах нашай рэспублікі.

БЯЗДУШНЫЯ АДНОСІНЫ ДА ХВОРЫХ

Мая жонка захварэла запаленнем лёгкіх. Поездам яе даставілі з сельсовета і Менск. На вакзале хворую забрала карэта хуткай дапамогі. У той-жа дзень я прыехаў у горад, каб даведацца аб становішчы жонкі. Пры «парадках», якія існуюць у некаторых менскіх медустановах, гэта аказалася не лёгкай задачай.

У хуткай дапамозе мне сказалі, што хворую адвезлі ў Клінічны гарадок. Дзве гадзіны я блукаў па ўсіх карпусах клінічнага гарадка ў пошуках жонкі, але дарэмна. Дзяжурныя сёстры ўсе як адна бяздушна адказвалі:

«Прозвішча Бачыла нідзе не зарэгістравана, наогул хуткая дапамога хворых не дастаўляла».

Так я ні з чым зноў паехаў у хуткую дапамогу, каб праверыць куды-ж усё-такі накіравалі хворую.

Дарэмнымі былі ўсе мае намаганні.

— Мы прозвішча не рэгіструем.— Вось адказ, які я атрымаў ад дзяжурнага.

І сапраўды, у хуткай дапамозе (загадчык—доктар Талкачоў) менш за ўсё цікавяцца чалавекам, яго лёсам. Адвезлі, і ўсё... А далей, як кажуць, хоць трава не расці.

Пасля цэлага дня пошукаў я, нарэшце, знайшоў хворую. Яна была ў першай тэрапеўтычнай клініцы Клінічнага гарадка.

У часе маіх блуканняў я даведаўся, што такія выпадкі ў Менску не навіна. Некалькі тыдняў таму назад з Міхаловіцкага торфзавода даставілі ў Менск хворага рабочага Іванчука. З вакзала яго забрала карэта хуткай дапамогі. На працягу 8 дзён старшыня тарфянога камітэта тав. Зубчонак ніяк не мог даведацца ў якую больніцу накіравалі хворага.

Каментарыі, як кажуць, непатрэбны.

Старшыня Новадворскага сельсовета І. БАЧЫЛА.

ТВОРЫ КЛАСІКАЎ МАРКСІЗМА-ЛЕНІНІЗМА НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

З года ў год у БССР павялічваецца выпуск твораў класікаў марксізма-ленінізма на беларускай мове. Ужо выданы мільёны экземпляраў кніг.

За 1924—1934 гады на беларускай мове выдана 109 назваў - тыражом у 1.224.000 экземпляраў. За апошнія тры гады партыйнае выдавецтва ЦК КП(б)Б выпусціла 138 назваў тыражом у 2.604 тыс. экз., у тым ліку 587 тысяч экз. даклада таварыша Сталіна аб праекце Канстытуцыі СССР на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Саветаў.

Сярод выданых у мінулым годзе твораў класікаў марксізма-ленінізма ёсць наступныя кнігі: «Да крытыкі палітэканоміі» — Маркса, «Антыдзюрынг» — Энгельса, ленінская бібліятэчка з 15 назваў, «Матэрыялізм і эмпірыёкрытыцызм» — Леніна, аднатомнік выбраных твораў Леніна—Сталіна, «Пытанні ленінізма» — Сталіна і інш.

У бягучым годзе выданне марксісцка-ленінскай літаратуры атрымае яшчэ больш шырокі размах. Партыйнае выдавецтва ЦК КП(б)Б у плане 1937 года намеціла выдаць рад буйнейшых работ. З твораў Карла Маркса выйдуць «Критика Готской программы», «Классовая борьба во Франции». Вядзецца работа над выданнем упершыню на беларускай мове першага тома «Капитала». 5 раздзелаў гэтага тома зараз перакладзены. У план уключана таксама выданне кніг Фрыдрыха Энгельса «Происхождение семьи, частной собственности и государства», «Диалектика природы», «Развитие социализма от утопии к науке».

Намечана выданне на беларускай мове поўнага збору твораў Леніна ў 30 томах, прычым рад тамоў павінны выйсці ў бягучым годзе. Работа ў гэтым напрамку ўжо вядзецца. Вышаў першы том. Другі, трэці і чацверты тамы знаходзяцца ў друку.

У гэтым-жа годзе выйдзе трохтомнік Леніна—Сталіна—зборнік твораў да вывучэння гісторыі ВКП(б), а таксама рад паасобных брашур Леніна — «О народничестве», «Очередные задачи советской власти», «Борьба за пролетарскую партию» і інш.

З твораў Сталіна выпускаюцца: сталінская бібліятэчка з 10 назваў, «Марксизм и национально-колониальный вопрос», «Отчетный доклад XVII с'езду ВКП(б)», «Итоги первой пятилетки» і т. д.

Агульны тыраж гэтых кніг дасягне ў 1937 годзе 400.000 экз.

М. КІН.

НЯЎВЯЗКІ

Чытачы газеты «Рабочий» прызвычаіліся ўжо да няўвязак, якімі рэдакцыя нярэдка іх частуе. Часта чытач, прачытаўшы газету, застаецца ў недаўменні, не ведаючы, якому матэрыялу верыць.

Днямі «Рабочий» паднёс сваім чытачам чарговую няўвязку. У газеце ад 11 студзеня г. г. у рэдакцыйнай інфармацыі паведамляецца, што «ўчора ў Менску адкрылася нарада ініцыятараў стаханаўскага руху ў Беларусі, якая склікана па ініцыятыве ЦСПСБ і газеты «Рабочий». На самой справе рэдакцыі газеты «Рабочий» ініцыятыва склікання гэтай нарады не належыла, у чым яна і распісалася 14 студзеня, забыўшы пры гэтым, «відаць па скромнасці», упамянуць аб памылцы, якую яна зрабіла.

У тым-жа нумары ад 14 студзеня ёсць яшчэ адна няўвязка. У перадавым артыкуле «Бюджет 1937 года» газета піша: «Дзяржаўны бюджэт, які вылічаецца больш чым сотняй мільярдаў рублёў...». Як вядома, дзяржаўны бюджэт, зацверджаны III сесіяй ЦВК СССР VII склікання, складае па даходах 98.069.500 тысяч рублёў. Аб гэтым «Рабочий» піша ў тым-жа нумары ад 14 студзеня ў справаздачы аб заключным пасяджэнні сесіі ЦВК СССР.

У гэты-ж дзень рэдакцыя «Рабочий» апублікавала тэлеграму сакратара ЦК КП(б)Б тав. Гікало ўсім сакратарам АК, ГК і РК КП(б)Б, трыкутнікам прадпрыемстваў БССР, прычым пры перадрукаванні тэксту тэлеграмы са «Звязды» яна дапусціла рад недакладнасцей.

Ці нельга, таварышы з рэдакцыі «Рабочий», больш уважліва адносіцца да матэрыялаў, якія друкуюцца ў газеце і паменш здзіўляць чытачоў няўвязкамі?

АТЭСТАЦЫЯ ПРАКУРОРАЎ І СЛЕДЧЫХ

Гэтымі днямі па БССР пачнецца атэстацыя пракурораў, следчых, сакратароў пракуратур, працуючых у сістэме пракуратуры рэспублікі. Атэстацыя будзе праведзена на працягу студзеня—лютага і ахопіць звыш 300 работнікаў. Створана рэспубліканская атэстацыйная камісія на чале з тав. Глезеравым.

Атэстацыйная камісія праверыць адпаведнасць пракурорска-следчых работнікаў новым задачам, якія выцякаюць са Сталінскай Канстытуцыі, палітычную і агульную пісьменнасць, веданне гэтымі работнікамі тэхнікі расследвання, бягучага заканадаўства і т. д.

ВАЕННА-СПАРТЫЎНЫЯ ГУРТКІ ПРЫ МТС

Шырока разгарнулася ваенна-абарончая работа ў машынатрактарных станцыях рэспублікі. Пры радзе МТС арганізаваны ваенна-спартыўныя гурткі. Рабочыя, служачыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі вывучаюць у іх стралковую, хімічную і санітарную справу. У гуртку пры Тураўскай МТС займаецца 54 чал., Кармянскай — 60, Пухавіцкай — 41, Лепельскай — 31, Уздзенскай — 30 чал. і т. д. Цяпер у гуртках ідзе інтэнсіўная падрыхтоўка, каб да сакавіка здаць нормы на значкі «Варашылаўскі стралок», «ППХА», «ГСА» і «ГПА».

БЛІЦ-ТУРНІР ПА ХАКЕЮ

12 студзеня ў 12 гадзін дня на ледзяное поле катка таварыства «Харчавік» выйшлі чатыры мацнейшыя хакейныя каманды гор. Менска. Бліц-турнір пачынаецца эстафетай. Усе 11 ігракоў кожнай каманды прабягаюць па 100 метраў, перадаючы адзін другому эстафету. Першае месца ў эстафеце заваёўваюць хакеісты тэхнікума фізкультуры, другое месца — «Тэмпа», трэцяе «Спартака».

Першы матч: тэхнікум фізкультуры — «Дынама». Тэхнічная і карэктная ігра хутка канчаецца перамогай ініцыятыўных хакеістаў тэхнікума, якія забілі ў вароты праціўніка адзін гол, ні аднаго не атрымаўшы ў адказ.

Зусім нечакана «Тэмп» аказаў моцнае супраціўленне «Спартаку». Рэзультат матча — 1:1, аднак перамога залічваецца камандзе «Тэмп» за лепшыя рэзультаты ў эстафеце. У фінале сустрэліся каманды тэхнікума фізкультуры і «Тэмпа».

Прыз турніра заваявала каманда тэхнікума фізкультуры. Яна-ж атрымала права прымаць удзел у аспрэчванні кубка СССР па хакею.

ЗДАРЭННІ

★ **Юрыст-консульт — хабарнік.** Да юрыст - консульта Жыляемкіраўніцтва В. І. Крыловіча звярнуўся за кансультацыяй па пытанню аб адпаўленні ў правах спадчыны па дом пасля смерці сваёй маці рабочы завода імя Кірава Рудэрман. Крыловіч параіў падаць іск у нарсуд, сказаўшы, што трэба заплаціць 458 рублёў судпошлін. Не згадзіўшыся на такую суму грошай, Рудэрман пайшоў. Тады Крыловіч нагнаў Рудэрмана і прапанаваў за 100 рублёў аслабаніць яго ад платы судпошлін. Крыловіч быў затрыман у момант атрымання гэтых грошай і прыцягваецца да адказнасці.

ПАЛЯВАННЕ

Гэты год вельмі багат пушным зверам. Не гледзячы на неспрыяючыя для паляванння кліматычныя ўмовы за 2 месяцы (лістапад, снежань) паляўнічыя БССР здалі на пункты Белзагатпушніны дзесяткі тысяч шкурак пушніны. План па нарыхтоўцы пушніны за 4 квартал 1936 г. Белзагатпушніна выканала на 127,8 проц.

Асобныя калгаснікі-паляўнічыя паказалі ўзоры ў загатоўцы высокакласнай пушніны. Калгаснік-паляўнічы Макар Мялешка (калгас «Чырвоны земляроб», Сіроцінскі раён) за 2 месяцы забіў 14 лісіц і 25 зайцаў. За праданую дзяржаве пушніну калгаснік з калгаса «Большэвік», Лёзянскага раёна, І. Рэут выручыў 895 р.

АД РЭДАКЦЫІ

Рэдакцыя газеты «Звязда» просіць тав. «А», прыслаўшага нам заметку з Сянно, паведаміць сваё прозвішча і месца работы.

ДЗЕННІК

— **Кансультацыя для сакратароў партканмаў і парторгаў** Сталінскага раёна, якія займаюцца ў раённым семінары, адбудзецца 15 студзеня ў 9 гадзін раніцы ў памяшканні клуба металістаў (райпартгабінет).

— **Семінар прапагандыстаў** Сталінскага раёна адбудзецца 15 студзеня ў 9 гадзін раніцы ў памяшканні клуба металістаў (3 паход).

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО

БДТ-1 — «Ваўкі і авечкі», Дзярж. Яўр. тэатр БССР — «Вораг», «Чырвоная ворка» — «Вратарь», Дзіцячы гукавы кінатэатр — «Карл Брунер», «Пролетарый» — «Бесприданница», «Інтэрнацыянал» — «Кандуіт», «Спартак» — «Пуцёўка ў жыццё».

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

ІНСТЫТУТ МАСАВАГА ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ ПАРТАКТЫВА пры ЦК КП(б)Б

паведамляе, што 15 студзеня ў 18 гадзін радыёстанцыямі транслюецца

ДАКЛАД тав. КАЛІНІНА

на семнаццатым Усерасійскім з'ездзе Советаў.

Слухайце арганізавана ў радыёаудыторыях, партгабінетах і індывідуальна на-даму.

Дырэктар ІМЗО пры ЦК КП(б)Б БЕКЕРМАН.

Гукавы кінатэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» Ад 15 студзеня

гукавы мастацкі фільм вытворчасці «Украінфільм»

КАНДУІТ

па матывах кнігі Льва КАСІЛЯ.

У галоўных ролях:

Нар. арт. рэспублікі В. ГАРДЗІН.

Заслуж. арт. рэспублікі А. КАСТРЫЧКІН.

Арт. КАНАВАЛАЎ І ВАТОЛІН.

МЕНГАРТОП

даводзіць да ведама ўсіх устаноў,

якія знаходзяцца на планавым снабжэнні палівам у гартопе, што

апошні тэрмін

прадстаўлення заявак

на ўсе віды спажываемага імі паліва—

15 студзеня г. г.

Заяўкі павінны быць прадстаўлены з дасканалымі тэхнічнымі разлікамі і нормамі на кожную адзінку.

Не прадставіўшыя вестак да вышэйуказанага тэрміну ў план снабжэння на 1937 год уключаны не будуць.

ДЫРЭКЦЫЯ МЕНГАРТОПА.

ПАСТАНОВА № 36|4

ПРЭЗІДЫУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА АД 29-XII 1936 ГОДА

АБ БАРАЦЬБЕ З БЕЗНАГЛЯДНАСЦЮ ДЗЯЦЕЙ.

Заслухаўшы інфармацыю гарана, горміліцыі і секцыі па барацьбе з беспрытульнасцю і безнаглядасцю дзяцей, прэзідыум горсовета адзначае значна павялічыўшуюся за апошні час безнаглядасць дзяцей у горадзе, стварыўшуюся ў рэзультаце слабай пазашкольнай работы школ, непрыцягнення да гэтай справы грамадскасці, адсутнасці масава-растлумачальнай работы на мясцах, недастатковай барацьбы з дзіцячымі правапарушэннямі з боку судовых органаў.

Для ліквідацыі безнаглядасці дзяцей у горадзе прэзідыум менскага горсовета **пастанаўляе:**

1. Абавязаць гарана: а) арганізаваць ва ўсіх школах розныя гурткі — літаратурныя, шахматна-шашачныя, музычныя і іншыя, забяспечыўшы іх кіраўнікамі і ўсімі неабходнымі прыладамі для штодзённай сістэматычнай работы;

б) арганізаваць сістэматычныя выхады школьнікаў на лыжах і каньках, паходы ў кіно і тэатры і розныя экскурсіі;

в) арганізаваць больш цесную сувязь паміж школай і сем'ямі вучняў, для чаго не радзей аднаго разу ў месяц склікаць бацькоўскія сходы, а таксама практыкаваць наведванне настаўнікамі вучняў на даму;

г) папоўніць школьныя бібліятэкі і наладзіць сістэматычнае забеспячэнне дзяцей кнігамі.

2. Даручыць нам. заг. гарана т. **Захарэвіч,** пад яе асабістую адказнасць, на працягу дэкады прадставіць прэзідыуму дакладныя даныя аб выкананні ўказаных у п. 1 мерапрыемстваў, а секцыі народнай асветы ўстанавіць сістэматычны кантроль за пазашкольнай работай у школах.

3. Устанавіць, што з 15 студзеня ўсе каткі горада: каток сталёўна «Дынама», харчавікоў, сада чыгуначнікаў і сада «Профінтэрн» з 10 гадз. раніцы да 15 гадзін дня на ўвесь зімовы сезон прадастаўляюцца для бясплатнага карыстання дзяцей. Прапанаваць дырэктарам гэтых катко́ў абсталяваць на іх цёплыя раздзявалкі, а гарана, горадраву і секцыі нарас веты ўстанавіць на катках дзяжурствы фізкультурнікаў, настаўнікаў, урачоў і членаў секцыі.

Прапанаваць дырэкцыі сада «Профінтэрн» абсталяваць у садзе ледзяныя горкі для бясплатнага карыстання дзяцей.

4. Абавязаць горжылсаюз і жыляемкіраўніцтва ва ўсіх дварах, дзе гэта магчыма, абсталяваць ледзяныя горкі. Спіс месц, дзе абсталяваны горкі, да 15 студзеня 1937 года прадставіць прэзідыуму.

5. Вылучыць для карыстання дзяцей наступныя пункты ў горадзе, забараніўшы па іх праезд усякага віду транспарта: па Чырвоназорнай вул., Ямнай вул., у раёне Старажоўкі каля летняга пляжа, па Маскоўскаму завулку і па Чычэрынскай вул. Кіраўніцтву добрабыту ўстанавіць у гэтых месцах загараджальныя адзнакі.

6. Для выяўлення безнаглядных дзяцей устанавіць дадатковы пункт прыводу безнаглядных на рагу Ленінскай і Совецкай вуліц у памяшканні дыспетчарскай трамвая. Устанавіць на пункце дзяжурства настаўнікаў і членаў секцыі з 6 да 12 гадзін ночы. Гарана і секцыі распрацаваць графік дзяжурстваў. Таксама ўстанавіць дзяжурствы настаўнікаў і членаў секцыі на пункце прыводу пры 1-м аддзяленні міліцыі.

Кіраўніцтву рабоча-сялянскай міліцыі для прыводу безнаглядных дзяцей на пункт вылучыць брыгады асоўміла і аднаго настаяннага работніка для дзяжурства на пункце.

7. Дзяжурствы брыгад асоўміла ўстанавіць у кіно, тэатрах, буйных магазінах і іншых пунктах скаплення безнаглядных дзяцей. На настаўнікаў школ і членаў секцыі ўскласці выяўленне хатніх умоў безнаглядзнага адразу пасля яго затрымання.

8. Указаць кіраўніцтву РС міліцыі і народным судам па неабходнасць публікацыі ў друку ўсіх выпадкаў накладання штрафаў на бацькоў за адсутнасць нагляду за дзецьмі і прыговоры судоў па справах няпоўнагадовых.

9. Пацвердзіць пастанову прэзідыума горсовета аб забароне продажу дзецям спіртных напіткаў і папярос і допуску дзяцей у кіно і тэатры ў нявызначаныя гадзіны.

Горупутгандлю і секцыі па барацьбе з беспрытульнасцю і безнаглядасцю арганізаваць сістэматычны кантроль за выкананнем данага пункта гэтай пастановы. Папярэдзіць усіх дырэктароў магазінаў, работнікаў прылаўка, дырэктароў кіно і тэатраў, што за парушэнне гэтай пастановы яны будуць прыцягвацца да суровай адказнасці.

10. Лічыць неабходным арганізацыю спецыяльнай дзіцячай камеры па справах няпоўнагадовых, для чаго паставіць гэта пытанне перад Наркамюстам.

Нам. старшыні менгорсовета ДРАБЫШЭЎСКІ.
Сакратар менгорсовета КАЗЛОЎСКІ.

ЗАГАД № 273

ПА МЕНГАРАНА ад 13 студзеня 1937 года.

§ 1.

Праведзены карнавал-ёлка 12 студзеня 1937 г. на катку стадыёна «Дынама» імя С. М. Кірава, прысвечаны сканчэнню зімовых канікул і пачатку другога паўгоддзя, прайшоў арганізавана ў выніку добрай падрыхтоўкі школ горада Менска да гэтага мерапрыемства.

§ 2.

За лепшыя касцюмы і прадстаўленні літаратурныя тыпы прэміраваць наступных пісераў і школьнікаў:

1. АРХІПАВУ (2-я школа), паказаўшую вучонага Ламаносава — лыжамі.
2. СОСІНА (2-я школа), паказаўшага паэта Пушкіна — канькамі з бацінкамі.
3. НЕКРАСАВУ (2-я школа), паказаўшую «Касцюм матэматыкі» — світрам.
4. РЫЖЫКАВА (2-я школа), паказаўшага паэта Шаўчэнка — світрам.
5. НАСЯЛОВІЧА (2-я школа) — касцюм цюрка — канькамі з бацінкамі.
6. АЎХІМЕНЬ (2-я школа) — касцюм цыганкі — лыжамі.
7. АНТАНОВІЧА (2-я школа) — касцюм цыгана — світрам.
8. СТРАМОК (2-я школа) — касцюм «Знакі прыпынку» з лозунгам «Палюбіце нас» — канькамі з бацінкамі.
9. КНОСПІН (3-я школа) — касцюм паезяніны — лыжамі.
10. БЕЛЬНІКА (5-я школа), паказаўшага Чарлі Чапліна — світрам.
11. ЛІТВІНА (5-я школа) — касцюм Торэадора — лыжамі.
12. ШТЭЙМАНА (5-я школа) — касцюм лётчыка з лозунгам «Будзем у ліку 150.000» — світрам.
13. ГЕРШОВІЧ (5-я школа) — касцюм усходні — світрам.
14. БЯСПРЫЗВАНАГА (8-я школа), паказаўшага «Піно» з фільма «Шукальнікі шчасця» — канькамі з бацінкамі.
15. СРЭБНІКА (8-я школа), паказаўшага Чарлі Чапліна — світрам.
16. АНУСЕВІЧ (9-я школа) — касцюм цыганкі — лыжамі.
17. ЛАДЫГІНУ (11-я школа) — касцюм беларускі — канькамі з бацінкамі.
18. САХОЎСКУЮ (11-я школа) — касцюм баярыні — світрам.
19. ГУТКОЎСКАГА (15-я школа) — касцюм каўкаскі — світрам.
20. РЫЖКОВІЧА (14-я школа), паказаўшага паэта Пушкіна ў маладосці — світрам.

§ 3

Дырэктару 2-й школы тав. Шульману І. П. за добрую арганізацыю падрыхтоўкі сваёй школы да карнавала-ёлкі абвясціць падзяку.

§ 4

Тав. Ладыгінай — мацеры прэміраванай вучаніцы 11-й школы, якая ўдзяляе вялікую ўвагу выхаванню сваіх трох дзяцей (выдатнікаў вучобы), за падрыхтоўку аднаго з лепшых касцюмаў на карнавал-ёлку, — абвясціць падзяку і прэміраваць юбілейным выданнем збору твораў Пушкіна.

§ 5

Зо добрую арганізацыю і правядзенне карнавала дырэктару дзіцячай спартыўнай школы пры Менгарана тав. Грышману А. І. абвясціць падзяку.

§ 6

Выношу падзяку за выключную ўвагу і дапамогу ў арганізацыі карнавала старшыні таварыства «Дынама» камбрыгу т. Емельянаву і дырэкцыі стадыёна «Дынама».

§ 7

Дырэктару 25 школы тав. Таршысу, не забяспечыўшаму ўдзел сваёй школы ў карнавале і тым самым сарваўшаму культурны адпачынак 4 забавы дзяцей, стаўлю на від.

Заг. менгарана КУЗНЯЦОВА.

Уп. Галоўлітбела № К—536. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Сверчкова, 63. К. Б. С.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2